Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

8 ЛЮТАГА 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 26 (25891)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ЗА ЗАБОЙСТВА ЗУБРОЎ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ ЗАБАРОНЕНА ПАЛЯВАННЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Звязда» пісала ўжо пра выпадковы факт браканьерства. У мінулым годзе грамадзянін Швейцарыі застрэліў у НП «Белавежская пушча» двух зуброў.

У нас замежны паляўнічы заплаціў штраф у памеры 27 тыс. еўра. А калі ён вярнуўся дамоў, то там яго чакаў непрыемны сюрпрыз. Чалавеку на ўсё жыццё забаранілі паляванне. Гэта пакаранне за забойства звяроў, занесеных у Чырвоную кнігу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Аляксандр Лукашэнка:

«МЫ — МОСТ ПАМІЖ РАСІЯЙ І ЗАХАДАМ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву Рэйтэр заявіў, што не адмаўляецца ад ідэі стварэння Саюзнай дзяржавы з Расіяй.

«Гэта была мая ідэя. Таму я ні ў якім выпадку не збіраюся ад гэтага адмаўляцца. Больш таго, у нашай краіне пытанне аб Саюзе Беларусі і Расіі было абмеркавана на рэферэндуме. Гэта — воля народа, і я абавязаны яе выконваць. Але на той саюз, як гэта бачыцца Расійскай Федэрацыі, Беларусь ніколі не пойдзе. Я аб гэтым гаварыў заўсёды», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сутнасць дзеючага дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ў тым, што Беларусь ні ў якім выпадку не страчвае свой суверэнітэт і не становіцца часткай іншай дзяржавы, у гэтым выпадку — Расіі, растлумачыў Прэзідэнт.

«Новаму кіраўніцтву Расіі гэта не падабаецца, і яны прапанавалі разбурыць гэты дагавор, стварыць нешта новае. Мы — катэгарычна супраць. Мы дзесяць гадоў з ранейшым кіраўніцтвам Расіі цаглінка да цаглінкі выбудоўвалі нашы адносіны. Таму мы не схільныя быць ініцыятарамі іх разбурэння», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Шчыра кажучы, мы да гэтага часу не разумеем, чаго ж хоча кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі. Або яно хоча будаўніцтва нашага саюза на прынцыпах ЕС, аб чым гаварыў прэзідэнт Пуцін, або каб Беларусь увайшла ў склад Расіі, аб чым апошнім часам пастаянна заяўляюць, у тым ліку і прапаноўваючы нам у якасці валюты расійскі рубель. Згадзіцеся, гэтыя дзве пазіцыі — несумяшчальныя. Гэта сведчыць аб тым, што ў Расіі нават па гэтых элементарных пытаннях не выбудаваны адносіны, не вызначана пазіцыя: або Беларусь становіцца суб'ектам Расійскай Федэрацыі (чаго ніколі не будзе!), або будаўніцтва саюзніцкіх адносінаў на прынцыпах Еўрапейскага саюза — гэта ж розніца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Будаўніцтва Расіяй нафтаправода ў абход Беларусі будзе каштаваць ёй у два разы даражэй, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву Рэйтэр, каментуючы планы кіраўніцтва «Транснафты» адносна будаўніцтва нафтаправода на поўнач ад Беларусі.

«Што да гэтых шляхоў, то толькі тыя, хто наогул не ўмее лічыць да дзесяці, здольныя выкарыстоўваць такія маршруты, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Трэба мець на ўвазе і пазіцыю еўрапейцаў, і асабліва шведаў і нарвежцаў, датчан, адносна таго, што перагружаная Балтыка такім чынам яшчэ навадняецца нафтай».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Гэта іх справа, іх права, мы перад сабой паставілі задачу, якую мы вырашым абавязкова, — дыверсіфікацыя паставак вугляводароднай сыравіны ў Беларусь».

Беларусь гатова адмовіцца ад фінансавых і эканамічных прэтэнзій да РФ, калі Расія зробіць аналагічна, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Такія «рыначныя адносіны», якія прапанавала нам Расія ў апошнія месяцы, не могуць садзейнічаць будаўніцтву Саюзнай дзяржавы. Гэта наогул супярэчыць разумнаму сэнсу і нармальным узаемаадносінам дзяржаў—саюзніц. Ну што гэта за саюзніца, калі яна паўтара года таму ў два разы павялічыла цану на прыродны газ, а праз паўтара года яшчэ раз у 2,5 раза падняла кошт вуглевадароднай сыравіны і ўвяла пошліну на нафту? Гэтым самым нашы суб'екты гаспадарання і прадпрыемствы пастаўлены ў становішча горшае, чым заходнія (я ўжо не гавару пра расійскія). Такім чынам, знішчана эканамічная аснова нашых адносінаў, якая была фундаментам», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што апошняя заява прэзідэнта Пуціна і выказванні іншых расійскіх службовых асоб «сведчаць аб тым, што яны хацелі б прадоўжыць саюзніцкія адносіны з нашай краінай».

«Мы да гэтага гатовы. Але для гэтага патрэбны канкрэтныя практычныя крокі. Са свайго боку мы гатовы іх зрабіць неадкладна і адмовіцца ад усякіх фінансавых, эканамічных прэтэнзій да Расійскай Федэрацыі, калі Расія зробіць аналагічна», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Узаемаадносіны дзяржаў, тым больш дружалюбных, саюзніцкіх, не могуць упісацца ў звычайную бухгалтарскую формулу. Гэта нешта большае», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што палітыка Расіі «ўсё больш і больш становіцца падобнай на амерыканскую, якую яны штогадзінна асуджаюць».

«Без усякіх на тое падстаў РФ ужо запісала сябе ў вядучыя цэнтры сілы ў свеце. З'явіліся нейкія імперскія замашкі. Ледзьве не ў кожным пункце свету прысутнічаюць расійскія інтарэсы, як яны заяўляюць. Быццам бы ў Беларусі прысутнічаюць толькі расійскія інтарэсы, напрыклад, а беларускіх інтарэсаў у самой Беларусі і быць не павінна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, «у гэтай частцы пазіцыя расійскага кіраўніцтва вельмі небяспечная не толькі для Беларусі».

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Дэмаграфічная бяспека

«ГАЛОЎНАЕ — НЕ ЛІЧБЫ, А ЛЮДЗІ»

Перспектывы рэалізацыі дэмаграфічнай палітыкі ў нашай краіне абмяркоўваліся ўчора падчас пасяджэння «круглага стала» ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

Дэмаграфічная палітыка сёння мае актуальнае значэнне для Беларусі. Таму, лічыць старшыня камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Палаты прадстаўнікоў Алег Вялічка, што перспектывы развіцця краіны залежаць не толькі ад эканамічнай сітуацыі, але і ў значнай ступені ад дынамікі развіцця народанасельніцтва. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі характарызуецца працэсам звычайнага спаду. Па даных на пачатак гэтага года ў краіне пражывае 9 млн 712 тыс чалавек, што на 37,8 тыс менш у параўнанні з пачаткам 2006 года. Увогуле ж у Беларусі смяротнасць перавышае нараджальнасць з 1993 года. У той жа час, лічыць А. Вялічка, можна заўважыць і некаторыя станоўчыя тэндэнцыі. Сярод іх у першую чаргу — рост нараджальнасці. Так, у 2006 годзе ў Беларусі нарадзілася 95 743 чалавекі, або 9,8 чалавека на тысячу насельніцтва, што адпавядае 106 працэнтам да 2005 года. Узровень смяротнасці пры нараджэнні ў нас адзін з самых нізкіх. Памяншаецца і ўзровень бяспечнага мацярынства. У апошні час таксама нязначна павялічылася сярэдняя працягласць жыцця. У 2005 годзе гэты паказчык (дарэчы, адзін з лепшых у СНД) адпавядаў 62,9 года для мужчын і 75,1 года для жанчын.

Для памяншэння адмоўных наступстваў дэмаграфічнай сітуацыі, адзначыў А. Вялічка, Беларусь прымае неабходныя меры. У прыватнасці, наша краіна першай у СНД прыняла закон аб дэмаграфічнай бяспецы. У 2005 годзе была прынята Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспецы на 2006—2010 гады. Значная частка намаганняў дзяржавы датычыцца фінансавых фактараў умацавання сям'і: павышаюцца памеры дзяржаўных дапамог, выплат шматдзетным маці, пашыраюцца правы на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля. У будучым можна весці гаворку аб рэалізацыі механізма пагашэння запазычанасцяў па няльготных крэдытах. Да прыняцця ў першым чытанні ў парламенце знаходзіцца законапраект, які прадугледжвае павелічэнне дапамог за нараджэнне дзяцей: з 2 да 5 бюджэтаў пражыткоўма мінімуму за нараджэнне першага дзіця і да 7 за нараджэнне другога і наступных. Акрамя таго, з 65 да 80 працэнтаў павінна павялічыцца дапамога па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Ва ўрад паступіла прапанова пашырыць пералік асобаў на атрыманне бясплатнага харчавання дзяцей ва ўзросце да двух гадоў. Паводле слоў намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыя Паўлава, пры рэалізацыі прапановы колькасць атрымальнікаў бясплатнага харчавання павялічыцца ў тры разы.

Намаганні нашай краіны па дэмаграфічнай бяспецы станоўча ацаніла прадстаўнік ААН/Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі Джыхан Султанаглу. Паводле яе слоў, гэтыя «праблемы выражаюцца на высокім узроўні». Таксама яна лічыць, што рэалізацыя намечаных мераў павінна прывесці да рэальнага і ўстойлівага прагрэсу. У той жа час, галоўнае ў дэмаграфічнай бяспецы не лічбы, а людзі. Намаганні дзяржавы павінны прывесці да рэальнага адчування людзьмі павышэння сваіх магчымасцяў і правоў.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Фота БЕЛТА.

НАРАДЖАЮЦЬ БОЛЬШ

У Брэсцкім абласным радзільным доме пасля вялікага перапынку летась і пазалетась нарадзілася па тройні. У мінулым годзе тут з'явілася на свет 64 пары двайнят. Цікава, што пік нараджальнасці двайнятак прыйшоўся на самы канец года. Па двое дзяцей у другой палове снежня з'явілася ў мам з Брэста, Камянца, Івацэвічаў, Брэсцкага, Кобрынскага, Камянецкага, Іванцэвіцкага раёнаў. Нібы сама прырода паклапацілася аб тым, каб дэмаграфічныя паказчыкі выглядалі прыгажэй. Спецыялісты схільны лічыць, што павелічэнне колькасці шматплодных родаў і ёсць адказ прыроды на памяншэнне нараджальнасці ў тым ці іншым рэгіёне планеты на пэўным адрэзку часу.

На калегіі ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама па выніках года былі агучаны лічбы, якія гавораць аб тым, што дэмаграфічная сітуацыя на Брэстчыне мае тэндэнцыю да паляпшэння. Летась у вобласці нарадзілася 15 599 немаўлят, што на 709 больш, чым год таму. Па Брэсцкаму раддому лічбы выглядаюць адпаведна так: 5181 і 488. З кожным годам памяншаюцца паказчыкі смяротнасці дзяцей ва ўзросце да года. Сярод прычын, што ўплываюць на паляпшэнне агульнай карціны, галоўны акушэр-гінеколаг абласнога ўпраўлення аховы здароўя Людзіка Матвяюк называе ўкараненне новых тэхналогій у рабоце медыцынскіх устаноў і паляпшэнне іх матэрыяльнай базы.

Найноўшым абсталяваннем у апошнія гады аснашчаны дзіцячыя бальніцы і перынатальныя цэнтры Брэста, Пінска, Баранавічаў, Кобрына. У Пружанах, Івацэвічах таксама ёсць новыя фетальныя маніторы, з дапамогай якіх можна выявіць паталогію плода на ранніх стадыях развіцця.

Залог паспяховага правядзення родаў — падтрыманне радзільных дамоў у стане, адпавядаючым самым сучасным патрабаванням. Зараз вядзецца рэканструкцыя Баранавіцкага раддома. На чарзе — абласны. Падышла чарга стварыць у Брэсце гарадскі радзільны дом. Праектна-каштарысная дакументацыя на ўзвядзенне новай установы будзе зроблена ўжо сёлета.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Ва ўрадзе

НАН Беларусі і Мінэнерга пачалі распрацоўку дзяржаўнай праграмы «Торф»

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі сумесна з Міністэрствам энергетыкі і ДВА «Белпаліўгаз» пачалі распрацоўку дзяржаўнай праграмы «Торф». Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання «Белпаліўгаз» Вітольд Варона.

Новая праграма нацэлена на развіццё тарфяной галіны і павелічэнне выкарыстання ў рэспубліцы торфу як мясцовага віду паліва. Завяршыць яе падрыхтоўку плануецца ў чацвёртым квартале 2007 года.

Паводле слоў Вітольда Вароны, адным з асноўных напрамкаў праграмы стане пашырэнне сыравіннай базы прадпрыемстваў ДВА «Белпаліўгаз» для павелічэння аб'ёмаў здабычы торфу і вытворчасці паліўных брыкетаў. Цяпер прадпрыемствы тарфяной прамысловасці распрацоўваюць менш як 1 працэнт ад агульных запасаў рэспублікі.

У 2007 годзе ў Беларусі плануецца здабыць каля 2,8 млн тон торфу, аб'ём вытворчасці паліўных брыкетаў складзе каля 1,29 млн тон.

«Існуе памылковае меркаванне, што прамыслоўцы могуць «забраць» заказнікі або якія-небудзь іншыя плошчы. Мы працуем толькі з вызначаным для нас фондам. Гэта значыць, калі Нацыянальная акадэмія навук разам з Мінпрыроды і іншымі ведамствамі вызначаць нам пералік перспектыўных радовішчаў з запасамі торфу, значыць, мы на гэтых радовішчах і будзем працаваць», — падкрэсліў ён.

Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.

ДЗМІТРЫЙ РАГОЗІН ЗАКЛІКАЕ НЕ ДАВЯРАЦЬ ДАНЫМ САЦАПЫТАННЯЎ АБ ПАГАРШЭННІ АДНОСІНАЎ РАСІЯН ДА БЕЛАРУСАЎ

Аб гэтым ён заявіў у Мінску журналістам перад пачаткам сустрэчы з намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД, старшынёй Славянскага парламенцкага саюза Сяргеем Касцянам.

Дзмітрый Рагозін падкрэсліў: «Немагчыма змяніць любоў, глыбокую павагу расіян да беларусаў — мы адной крыві, у нас адзін лёс». Пры гэтым ён яшчэ раз адзначыў, што энергетычны канфлікт не прывёў да змянення адносінаў грамадзян Расіі да Беларусі. «Ёсць іншае — людзі пачынаюць разумець, што ў кожнай з краін ёсць свае нацыянальныя інтарэсы і, безумоўна, ёсць канфлікты, — сказаў ён. — Я лічу, што калі мы выходзім на рыначныя цэны, то трэба было гэта пытанне вырашаць паэтапна, а не метадам шокавай тэрапіі». У сувязі з гэтым Дзмітрый Рагозін падкрэсліў, што «ў Мінску ёсць разуменне гэтых пытанняў, мы не дадзім разладзіць расійска-беларускія адносіны».

Аляксандр СУХАВЕРХІ, БЕЛТА.

МІНЮСТ ЗАСТУПІЎСЯ ЗА СПАЖЫЎЦОЎ

Міністэрства юстыцыі падрыхтавала праект указа кіраўніка дзяржавы, накіраванага на абарону правоў добрасумленных спажыўцоў.

Як патлумачыў кіраўнік Мінюста Віктар Галаванаў, зараз у Беларусі здараюцца выпадкі, калі грамадзяне набываюць у крамах дарагія тавары, а потым высвятляецца, што рэчы былі завезены ў нашу краіну з парушэннем мытнага заканадаўства. У выніку добрасумленныя пакупнікі становяцца без віны вінаватыя: тавары канфіскуюцца. Каб не ўшчамляліся правы такіх асобаў, будзе прыняты ўказ, якім плануецца ўвесці забарону на канфіскацыю добрасумленна набытых тавараў у рознічнай сеткі на тэрыторыі Беларусі. Паводле слоў міністра, праект памянёнага дакумента падтрыманы ўжо ў шэрагу рэспубліканскіх органаў улады і знаходзіцца зараз ва ўрадзе.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«НАЕХАЛІ» НА МАРШРУТКУ

У Гомельскім раёне у аўторак каля васьмі гадзін вечара на дарозе паблізу вёскі Заліп'е рабочы аднаго з гомельскіх унітарных прадпрыемстваў, які знаходзіўся за рулём аўтамабіля «Жыгулі», выскачыў на палосу сустрэчнага руху. Машына сутыкнулася з маршрутным таксі «Газель», якая рухалася насустрач. Двое гамяльчан, што знаходзіліся ў салоне «жыгулёў», загінулі на месцы ДТЗ, а вадзіцель гэтага аўто, які быў дастаўлены ў бальніцу, пазней памёр.

Ігар ГРЫШЫН.

Міжнароднае Свята Кнігі — у Мінску

Учора ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭКСПА» (вул. Я. Купалы, 27) адбылося ўрачыстае адкрыццё 14-й Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу «Кнігі Беларусі-2007».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч, які вёў цырымонію адкрыцця, адзначыў, што ў выстаўцы бяруць удзел больш як 600 прадстаўніцтваў з 16 краін свету. «Арганізатары выстаўкі пастараліся зрабіць усё магчымае, каб гэта мерапрыемства прайшло з вялікай карысцю для ўдзельнікаў. Будуць канферэнцыі, «круглыя сталы», сустрэчы з пісьменнікамі... Спадзяюся, будуць заключаны шматлікія кантракты, што паслужыць узаемнаму культурнаму ўзбагачэнню краін—удзельніц выстаўкі», — падкрэсліў Уладзімір Васільевіч.

Міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук назваў выстаўку святам кнігі: «Нягледзячы на існуючыя найноўшыя тэхналогіі Яе Вялікасць Кніга застаецца на першым месцы. Бібліятэкі краіны летась набылі каля 110 тысяч экземпляраў кніг. Адно з асноўных накірункаў у рабоце бібліятэк — папаўненне кніжнага фонду. Цудоўна, што арганізатары запланавалі правесці бібліятэчны дзень, калі тут будуць актыўна працаваць кіраўнікі бібліятэк — наладжваць кантакты, заключаць дагаворы...».

У гэтым годзе ганаровым госцем выстаўкі ўпершыню стала Украіна. Старшыня Дзяржаўнага камітэта тэлебачання і радыёвяшчання Украіны Эдуард Прутнік паведаміў, што Украіна прадставіла паўтары тысячы найменняў кніг, у выстаўцы ўдзельнічае каля ста выдавецтваў... У сваю чаргу, ён запрасіў усіх удзельнікаў Мінскай міжнароднай выстаўкі ўзяць удзел у Кіеўскай міжнароднай выстаўцы, якая адкрыецца 31 мая.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец адзначыў, што кніга — сувязнае звяно паміж народамі і культурамі.

Нагадаем, што выстаўка-кірмаш будзе працаваць да 11 лютага. Пройдуць тры тэматычныя дні: «Дзень школьніка» (8 лютага), «Бібліятэчны дзень» (9 лютага) і «Дзень студэнта» (10 лютага).

Першы дзень працы выстаўкі-кірмашу засведчыў вялікую цікавасць людзей самых розных узростаў да падзеі. Без кніжных пакупак не застаецца ніхто...

Таццяна ПАДАЛЯК.

(Працяг тэмы на 3-й стар.)

Украіна прывезла свае лепшыя кнігі

Учора адбылося афіцыйнае адкрыццё Дзён Украіны на XIV Мінскай міжнароднай выставе-кірмашы. Украіна — ганаровы госць выставы, яе дэлегацыя складае каля 60 чалавек — кнігавыдаўцы, распаўсюджвальнікі, аўтары і прадстаўнікі кнігавыдавецкай і інфармацыйнай галіны. Яны прывезлі на Мінскую выставу больш за 1,5 тысячы назваў кніг — гэта лепшыя нацыянальныя выданні за апошнія два гады.

Удзельнікаў і гасцей выставы вітаў старшыня Дзяржаўнага камітэта тэлебачання і радыёвяшчання Украіны Эдуард Прутнік. — Упэўнены, што выстава-кірмаш для выдаўцоў усіх краін — удзельніц сыграе ролю своеасаблівага моста дружбы..

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ISSN 1990-763X

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу:
220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,
сообщает о проведении встречи с акционерами банка — физическими лицами.

Встреча состоится 13 февраля 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32. Начало встречи в 11.00

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.

Телефоны для справок: (017) 218-84-04, 218-84-38.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.02.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 142,00
1 еўра	2 781,92
1 латвійскі лат	3 995,15
1 літоўскі літ	804,84
1 чэшская крона	98,85
1 польскі злоты	719,32
1 расійскі рубель	80,82
1 украінская грыўня	424,77

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,5040
10 UAH	52,3009
1000 BYR	12,3117
EUR	34,4128

Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.02.2007 г.)

USD	2220 / 2320

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падлягае на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Твае правы

ДАГАВОР. З ДАДАТКОВАЙ ГАРАНТЫЯЙ

Як вядома, работа — гэта не толькі абавязкі, але і правы. І ў тым ліку дадатковыя гарантыі на падставе калектыўных дагавораў. Між тым, не сакрэт: наконт апошніх раз-пораз узнікаюць няпростыя пытанні. Наколькі абавязковым з'яўляецца само заключэнне калдагавора, ці распаўсюджваецца ён на работнікаў, якія не ўваходзяць у прафсаюз, і што рабіць у выпадку, калі тыя ці іншыя пункты дагавора проста не выконваюцца? З усім гэтым і іншым мы паспрабуем разабрацца з дапамогай намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення вытворчай і сацыяльна-эканамічнай работы Федэрацыі прафсаюзаў Сяргея Васільевіча КАХАНСКАГА.

Першы крок — стварыць прафкам

Нягледзячы на неаднаразовыя прапановы прафсаюзаў, даводзіцца канстатаваць як факт: цяперашняе заканадаўства не ўтрымлівае нормы, паводле якой заключэнне калектыўнага дагавора з'яўляецца абавязковым патрабаваннем. Тым не менш паколькі сам па сабе калдагавор прадугледжвае больш высокія гарантыі, не выпадае сумнявацца — ён уяўляе цікавасць. Прычым першнаперш для наёмных работнікаў. Такім чынам, што трэба рабіць для таго, каб такі дагавор у рэшце рэшт з'явіўся?

— Працоўны кодэкс вызначае, што прадстаўляць інтарэсы работнікаў зараз па сутнасці можа толькі прафсаюзная арганізацыя, і ў тым ліку, калі гаворка ідзе аб перамовах і заключэнні калектыўнага дагавора, — адзначае Сяргей Каханскі. — Такім чынам, калі работнікі пэўнага прадпрыемства ці ўстановы жадаюць мець калдагавор, то першы крок да гэтага — стварэнне прафсаюза. І ў сваю чаргу задача апошняга — разам з наймальнікам вызначыцца па дадатковых сацыяльных гарантыях членам працоўнага калектыву.

Асобная тэма — невялікія працоўныя калектывы. У прынцыпе, канкрэтных умоў па колькасці персаналу, «дастатковай» для заключэння калдагавора, не існуе. Адно зноў-такі варта нагадаць: дагавор з наймальнікам «вядзе» прафсаюз. А ў прафсаюзнай арганізацыі не можа быць менш за 3 чалавекі. Праўда, тут таксама існуюць варыянты.

— Ёсць шмат прыкладаў, калі ў таго ж індывідуальнага прадпрымальніка працуе ўсяго 1 ці 2 чалавекі, — кажа Сяргей Каханскі. — Фармальна ў такім выпадку весці размовы аб калектыўным дагаворы немагчыма. У той жа час на многіх рынках прадпрымальнікі маюць свае аб'яднанні. І заключаць калдагавор у рамках такіх аб'яднанняў у цэлым ніхто не забараняе.

Новы дрэваапрацоўчы цэх ААТ «Аршанскі камбінат будматэрыялаў» прыступіў да работы ў г.п. Копысь Аршанскага раёна. Пабудаваны ён па даручэнню Прэзідэнта Беларусі. На новых плошчах ужо прыступілі да выпуску еўрападдонаў. Сёлета іх плануецца выпусціць звыш 250 тыс. штук.

На здымку: станочнікі Алег МЕЛЕЖ і Сяргей КАНДРАЦЬЕЎ за работай.

БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Мэты розныя. Патрэбны... кампраміс?

Аплата працы, прэміі, надбаўкі, матэрыяльная дапамога да юбілею або прызыву ў армію, з нагоды нараджэння дзіцяці ці смерці блізкага чалавека, падтрымка ў будаўніцтве жылля, перавагі пры скарачэнні штатаў і нават тэмпература ў вытворчых памяшканнях — як вядома, усё гэта можа быць прадметам калектыўнага дагавора. Аднак непасрэдна ўзровень дадатковых гарантый у кожнай арганізацыі «свой». Бо фінансавыя магчымасці арганізацый — таксама розныя.

— Безумоўна, пры заключэнні калектыўнага дагавора наймальнік і наёмны работнік маюць абсалютна розныя мэты, і калі першы імкнецца як мага менш «даць», то другі — як мага больш атрымаць, — зазначае Сяргей Каханскі. — І ў гэтай сітуацыі важна знайсці той самы «баланс інтарэсаў». Таму Федэрацыя прафсаюзаў заўсёды раіць праводзіць папярэдняе абмеркаванне дамоўленасцяў. Прычым пажадана — на сходах у структурных падраздзяленнях. Бо ў сітуацыі, калі работнік ведае аб рэальным становішчы ў арганізацыі «з першых вуснаў», у калектыве ствараецца нармальны псіхалагічны клімат. І, як правіла, падчас разгляду дагавора на агульным сходзе завышаных патрабаванняў ужо не ўзнікае.

Калі прыйсці да згоды не ўдаецца, то, раіць Сяргей Каханскі, ісці на падпісанне калектыўнага дагавора ўсё ж трэба. Аднак на падпісанне з неўрэгуляванымі рознагалоссямі. З тым, каб паспрабаваць знайсці кампраміс па пратаколу рознагалоссяў пазней — зноў-такі на агульным сходзе калектыву.

Дарэчы, мяркуюць у прафсаюзах, прыняцце калдагавора з'яўляецца бясспрэчным плюсам і для самога наймальніка. Бо дадатковыя гарантыі — не толькі «лішнія» грошы, аднак і, да прыкладу, лепшы сродак затрымаць кваліфікаваны персанал. Інакш кажучы, пазбегнуць «бягучкі».

Таксама відавочная перавага (і асабліва для сярэдніх і буйных прадпрыемстваў) у тым, што падчас распрацоўкі калдагавора ў яго можна «закласці» ўмовы аплаты працы. У адваротным выпадку зрабіць гэта давядзецца ў індывідуальных дагаворах з кожным работнікам. А гэта — выдаткі на ўтрыманне «дадатковых» кадравікоў.

Нарэшце, варта заўважыць, што пры прадастаўленні некаторых выплат у рамках калдагавора можна атрымаць пэўную эканомію сродкаў. Так, згодна з заканадаўствам, некаторыя з такіх выплат вызваляюцца ад падатка аблкладання. Да прыкладу, тут маецца на ўвазе матэрыяльная дапамога ў памеры да 30 базавых велічынь, якую ёсць магчымасць аказаць работніку адзін раз на працягу года.

Члены прафсаюза — без пытанняў

Знаходзіцца ў прафсаюзе ці не — асабісты выбар кожнага работніка. Таму адно з традыцыйна «папулярных» пытанняў — ці распаўсюджваецца калектыўны дагавор на чалавека, які выражыў застацца па-за прафсаюзнай арганізацыяй?

— Згодна з Працоўным кодэксам, калектыўны дагавор распаўсюджваецца на наймальніка і ўсіх работнікаў, ад імя якога ён заключаны, — кажа Сяргей Каханскі. — Адпаведна, паколькі дагавор «вядзе» прафсаюз, то вызначаныя тут гарантыі ў абавязковым парадку датычацца кожнага яго члена. Праўда, адначасова калдагавор можа распаўсюджвацца і на не членаў прафсаюза. Аднак пры ўмове, што апошнія выкажуць такое жаданне ў пісьмовай форме.

Парушэнні магчыма аспрэчыць

Мінімальны тэрмін дзеяння калектыўнага дагавора вызначаны ў адзін, а максімальны — у тры гады. Пры гэтым варта мець на ўвазе, што, з улікам пагаршэння ці паляпшэння фінансавага стану прадпрыемства, пэўныя нормы дагавора ў гэты час могуць змяняцца. Аднак выключна пры ўзаемнай згодзе як наймальніка, так і прадстаўніка працоўнага калектыву — прафсаюза.

Але ці не самае складанае пытанне — невыкананне калектыўнага дагавора. Як быць у такой сітуацыі?

— Адказнасць бакоў за непрадастаўленне гарантый, замацаваных у калектыўным дагаворы, павінна прадугледжвацца тым жа дагаворам, — тлумачыць Сяргей Каханскі. — Аднак калі падобная адказнасць не вызначана, у работнікаў ёсць права распачаць калектыўную працоўную спрэчку — і ў тым ліку ў працоўным арбітражы ці судзе. Прычым трэба мець на ўвазе, што рашэнні таго ж працоўнага арбітражу з'яўляюцца абавязковымі для абодвух бакоў.

Сяргей ГРЫБ.

Семежава плануе рэкорды...

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

Толькі два працэнты ад усёй колькасці малака, атрыманага летась сельскагаспадарчым вытворчым кааператывам «Семежава», пайшло не вышэйшым гатункам. Астатнія 98 працэнтаў ад усіх надоеных кілаграмаў адпавядалі самым высокім патрабаванням па тлустасці і смаку. Дзякуючы пераабсталяванню ўчасткаў малочнай гаспадаркі, у прыватнасці, набыццю вялікіх чатырох-, пяці- і васьмітонных халадзільных установак закрытага тыпу, новых даільных апаратаў стала магчыма ўдасканальваць не толькі якасць. Усе ўчасткі малочнатаварнай фермы атрымалі ў сярэднім больш за пяць тысяч літраў ад адной каровы.

— А яшчэ пяць—сем гадоў таму сітуацыя ў Семежаве была, шчыра кажучы, дрэннай, таму што каровы хварэлі на лейкоз і сухоты. Асаблівую трывогу выклікаў участак нумар тры малочнатаварнай фермы, — узгадвае галоўны ветэрынарны ўрач Капыльскага раёна Леанід Паляшчук. — А зараз пра тое, што ў жывёлы былі хваробы, ужо і не памятаюць — дзякуючы вялікай працы праблема знікла. Той жа трэці ўчастак у СВК «Семежава» ў 2006 годзе паставіў рэкорд — 6232 кілаграмы малака ў сярэднім ад каровы.

У планах гаспадаркі — выйсці на абсалютныя сто працэнтаў вытворчасці малака вышэйшага гатунку. Таму сёлета «Семежава» працягне сваё развіццё. Напрыклад, новы комплекс, які разлічаны на 720 галоў, пачне працаваць у гэтым годзе. Дзяржавай былі выдаткаваны сродкі на набыццё неабходнага абсталявання і матэрыялаў, аднак усе работы праводзіліся толькі ўласнымі сіламі — гаспадарчым спосабам, брыгады будаўнікоў «збоку» не наймаліся. Гэта дазволіла эканоміць сродкі. Увогуле, грошы тут лічыць навучыліся — яшчэ летась перарабілі сістэму ацяплення гаспадаркі на той выпадак, каб цалкам перайсці на мясцовыя віды паліва.

Як лічаць работнікі фермы, гаспадарчыя поспехі залежаць і ад таго, як арганізавана праца. У «Семежаве» яшчэ некалькі гадоў таму змянілі рацыён жывёлы, што адразу ж адбілася і на якасці малака. Як толькі пачалі ўводзіць новыя падкормкі, дабаўкі, адразу павысіліся надоі.

— Паказчыкі паляпшаем за кошт маладняку ў статку, акрамя таго, мы пачалі актыўна ўжываць даільныя апараты тыпу «Ялінка». Па-новаму арганізаваны ў вытворчым кааператыве і працэс кармлення. Зараз жывёла мае свабодны доступ да кармоў, мы яе не трымаем на прывязі, — падкрэслівае загадчык фермы Уладзімір Рубецкі. — Новае, цалкам механізаванае халадзільнае абсталяванне закрытага тыпу, якое мы ўсталявалі за два гады, дазваляе рэгуляваць тэмпературу сыравіны, захоўваць яе ў належным стане.

У апошні раз прамысловы халадзільнік для захоўвання толькі што атрыманага малака набылі ў сярэдзіне 1980-х. Вялікі нямецкі апарат працаваў добра, аднак з цягам часу пачаў рабіць усё наадварот — замест таго, каб астуджаць сыравіну, ён у аўтаматычным рэжыме адключаўся, і малако псавалася. Давялося яго замяніць.

Змены ў СВК «Семежава» прыметныя не толькі ў вытворчай сферы. З развіццём аграгарадка ў хатах жыхароў з'явіўся газ, асартымент у мясцовай краме зараз у стане задаволіць усе спажывецкія густы. У мясцовым музеі вёскі адчыніўся і раённы музей народнага ткацтва. Амаль усе экспанаты падарылі жыхары Семежава і краязнаўчы музей. Музей з'яўляецца не проста памяшканнем, дзе захоўваюцца ўзоры, вырабленыя народным майстрам: тут працуюць разнастайныя гурткі для дзяцей, а яшчэ ёсць майстэрня, дзе па ўсіх старажытных законах мастацкай творчасці ствараюць сапраўдныя беларускія габелены і ткуць тканіну. Мэта музея — адрадзіць былыя традыцыі Капыльшчыны.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

ЧЫТАННЕ, ЛІЧЭННЕ, ШЫЦЦЁ — ДАСТУПНЫЯ ДЛЯ ІНВАЛІДАЎ

У Камянецкім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва адкрыўся рэабілітацыйны пункт для дзяцей-інвалідаў і маладых інвалідаў. Для новай установы набыты спецыяльныя кнігі і сшыткі для інвалідаў па зроку, гадзіннікі і калькулятары з сінтэзам мовы, палкі для хады. Аматары рукадзелля змогуць скарыстаць спецыяльныя швейныя іголкі і сантыметровую стужку з заклёпкамі. У кабінеце ёсць тэлевізар і DVD-прайгравальнік. Як паведаміла начальнік аддзела ідэалагічнай работы Камянецкага райвыканкама Ірына Негірыш, хутка пункт будзе пашыраны, для яго адведзены яшчэ адзін кабінет.

Яна СВЕТАВА.

КАМУНА ВЯСКОВЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Хрысціянская дабрачынная грамадская арганізацыя «Табея» ажыццяўляе ў Бялыніцкім раёне сацыяльны праект для састарэлых людзей. Ужо другі год 15 нямоглых старых з навакольных вёсак аб'ядноўваюцца на зіму ў своеасаблівую пенсіянерскую камуну. Мяркуецца, што ў наступным сезоне яна яшчэ пашырыцца.

На тэрыторыі Цяхцінскага сельскага Савета паблізу вёскі Прыбар арганізацыя «Табея» некалькі гадоў таму пабудавала дзіцячы аздараўленчы летнік. Там у маляўнічым месцы на беразе ракі стаяць драўляныя добраўпарадкаваныя хаты. У летніку за сезон бясплатна аздараўляецца паўтысячы дзяцей, прычым пераважная большасць — сацыяльна неабароненыя. А потым у кіраўніка дабрачыннай арганізацыі Паўла Бродава ўзнікла ідэя браць на зіму састарэлых людзей і засяляць іх у лагер.

— Я бачу, што некаторыя старыя ў вёсках засталіся зусім адны і без нічога, — расказвае Бродаў. — Гэта ў асноўным жанчыны, якія ў вайну былі падлеткамі. У іх вельмі падобныя лёсы. З вайны іх хлопцы не прыйшлі, замуж дзяўчаты не выйшлі і засталіся ў бацькоўскіх хатах, а потым сталі іх гаспадынямі. Яны самі састарыліся разам з гэтымі хатамі. Дзеці, у каго яны былі, з'ехалі і маюць свае жыццё далёка ад бацькоў... Такіх людзей шмат у вёсках. І як ім існаваць далей — ніхто не ведае. А ў нас узнікла ідэя сабраць іх разам.

Такі план ухвалілі магілёўскія і бялыніцкія ўлады. А аддзел сацыяльнай абароны Бялыніцкага райвыканкама падабраў людзей. Іх засялілі ў памяшканні дзіцячага лагера, якія раней узімку пуставалі. Там уключылі ацяпленне і стварылі ўмовы для пражывання — чыстая бялізна, рыгатаваная смачная ежа, цёплая прыбіральня і штотыдзень лазня. Асабліва прыемна для старых апошняе: бо каб натапіць лазню ў вёсцы, трэба дапамога моцнага мужыка, які б нацягаў дроў і вады. У камуне пенсіянерам дапамагаюць валанцёры.

Камунары — 8 жанчын і 7 мужчын. Усе яны — вясковыя жыхары, якім больш за 80 гадоў. У двух мужчын адмарожаны пальцы на нагах, яны цяжка рухаюцца і без дапамогі абысціся не могуць. І хоць усе — добрыя людзі, але лёсы так склаліся, што яны засталіся адны. Напрыклад, адна жанчына добра працавала і зарабіла пенсію ў 300 тысяч рублёў. Гэта пенсіянерка ўсё жыццё пражыла ў вёсцы сярод бялыніцкіх балот, а хата цяпер разбураецца, на дапамогу дзяцей разлічваць не выпадае, а ў самой няма здароўя і сіл заняцца яе рамонтам.

Камунай кіруе Таццяна Елісеева. Яна — добраахвотная памочніца, але і ёй з-за асабістых складаных жыццёвых абставінаў праца ў камуне вельмі дарэчы. Жанчына не толькі гатуе ежу, але і дапамагае пенсіянерам мыцца і прыбірацца. Тут запатрабаваны яе навыкі медыцынскай сястры, а таксама цярплівасць. Яна вельмі ўважлівы чалавек і з вялікай павагай ставіцца да старых.

Праект «Табеі» не патрабуе дадатковых дзяржаўных сродкаў: камунары жывуць разам па прынцыпах самафінансавання. Кожны з жыхароў аддае ў агульны «кацёл» са сваёй пенсіі 120 тысяч рублёў. Імі плацяць за святло і паліва, мыццё бялізны і адзення, набываюць харчы і сродкі гігіены. Праўда, некаторыя атрымліваюць пенсіі меншыя за дагаворную суму, таму ім даводзіцца аддаваць усю пенсію. Гавораць, што грошай ім не шкада, таму што ўзімку на 120 тысяч у месяц не пражывеш. А разам усё ж такі больш эканомна.

Праўда, грошай на ўсё не хапае, прызнаецца Бродаў. Але тут падключаюцца магчымасці дабрачыннай арганізацыі і іх вопыт работы са спонсарамі. Яны просяць у сельскіх гаспадарак бульбу і гародніну. Дапамагаюць, як правіла, ахвотна. Фермер з Круглянскага раёна Сяргей Дудкін прывёз старым дзве бочкі капусты, агуркоў, некалькі вёдраў сушаных яблыкаў. А вось мяса, курыцу, рыбу даводзіцца набываць самім. Праўда, той жа суп гатаваць на 15 чалавек танней, чым рабіць гэта паасобку для кожнага.

— Людзі жывуць у цеплыні і чысціні і нам за гэта дзякуюць, — гаворыць Павел Бродаў. — Штодзень катлетка, сасіска, масла, бутэрброд. Дома яны так не ядуць і не адпачываюць. Тут яны разам, ім весялей, і калі я да іх прыязджаю, то старыя бясконца распавядаюць мне «казкі» пра сваё жыццё.

Старшыня Бялыніцкага райвыканкама Аляксандр Ільянаў падарыў камуне тэлевізар. А памочнік Прэзідэнта і галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў знаёміўся з новым сацыяльным праектам на месцы: з тартамі і пячэннем прыехаў піць чай са старымі.

Сезон доўжыцца з 15 кастрычніка па 15 красавіка. Потым пенсіянеры раз'язджаюцца ў родныя мясціны — улетку жыць прасцей. На наступны сезон, як правіла, прыязджаюць новыя людзі.

Пагалоскі пра камуну ў Прыбары разлятаюцца па сельскіх мясцовасцях, з розных сельсаветаў у «Табею» звяртаюцца з просьбамі ўзяць старых. Таму Павел Бродаў са сваімі паплечнікамі вырашыў пайсці далей і пашырыць сацыяльны праект.

Непадалёк у вёсцы Асман-Касаева стаяць безгаспадарныя драўляныя будынкі. Былая школа, сталоўка, медпункт, настаўніцкія хаты — усе яны ў добрым стане, але нікому не патрэбныя і таму паступова разбураюцца. Бялыніцкі райвыканкам прыняў рашэнне бясплатна перадаць будынкі «Табеі», і неўзабаве іх пачнуць перавозіць на тэрыторыю аздараўленчага лагера ў Прыбары. Цяпер робіцца праектна-каштарысная дакументацыя для будаўніцтва пансіяната суменснага пражывання для састарэлых людзей.

Паводле планаў, у гэтым пансіянаце круглы год будуць жыць 30 чалавек. Гэта будуць людзі, якім няма куды падацца на схіле жыцця. Напрыклад, мужыкам без пальцаў на нагах. «Ну куды я іх выганю?» — засмучаецца Бродаў.

Мяркуецца, што ў новым комплексе будзе асобная сталоўка і веранда. Невялікія пакоі на 3—4 чалавекі. Новая мэбля і падлога з дывановым пакрыццём, каб нагам было цёпла. На будоўлі гатовы працаваць шмат валанцёраў. «Табея» плануе прыцягнуць да гэтага новага праекта сродкі замежных і беларускіх спонсараў, каб агульнымі сіламі пабудаваць утульны дом для вясковых пенсіянераў.

— Я таксама разлічваю, што новы праект ажывіць маю родную вёску, — прызнаецца ўраджэнец Прыбара Павел Бродаў. — На маёй вуліцы, якая даўжынёю з кіламетр, цяпер засталіся толькі дзве хаты, дзе жывуць людзі. А летнік і пансіянат павінны спыніць паміранне Прыбара. Можа, наша справа будзе развівацца і сюды зноў прыедуць жыць людзі?.. Хочацца спадзявацца на гэта.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У кіраўніка дабрачыннай арганізацыі ёсць свае ідэі, як арганізаваць жыццё для пенсіянераў. Напрыклад, ён лічыць, што ў ідэале ў кожным новым доме можна будаваць адзін пад'езд для старых. Аднак рабіць для іх жыллё па асобнаму праекту: напрыклад, некалькі блокаў са спальнага пакоя і кухні, і для ўсіх — адзін вялікі хол, дзе можна збірацца для размоў і прагляду тэлепраграм. Гэта можна назваць сумесным пражываннем.

А ў сельскай мясцовасці, марыць Бродаў, варта хоць бы на зіму рабіць камуны. У кожнай вёсцы вызначыць хату ў добрым стане, куды засяляць старых, якім цяжка жыць адным. Сацыяльнаму работніку сабраць з кожнага жыхара такога дома грошы за абслугоўванне і клапаціцца пра ўсіх адразу. Каб пражыць разам цяжкі зімовы час, а вясной вярнуцца ў свае хаты.

— І такім чынам можна было б крыху зняць праблему са старымі ў вёсках, — гаворыць Бродаў. — Памятаю, іду па Прыбару, а бабка Агапа спрабуе выцягнуць ваду з калодзежа. Калодзеж абмерзлы, больш за 20 метраў глыбіні. Яна з усіх сіл цягне вядро, спатыкаецца... Я дапамог, зайшоў у хату. Халодна, хата брудная, гаспадыня спіць на печы. А я памятаю, калі мяне, хлопчука, гэтая бабка частавала морквай. Цяпер яна састарылася, і мая чарга паклапаціцца пра яе. Такім, як бабка Агапа, прызначаны наш новы праект.

Калі ўсё будзе добра, пансіянат суменснага пражывання пенсіянераў будзе гатовы прыняць сваіх жыхароў напрыканцы гэтага года, перад пачаткам новага халоднага сезона.

Ілона ІВАНОВА.

АДШУКАЮЦЬ ПРАПАЎШЫХ ХУТЧЭЙ

У Віцебску будзе створана адзіная камп'ютарная база, што значна палепшыць вышук людзей, аб месцазнаходжанні якіх цікавяцца іх сваякі, знаёмыя. Установы аховы здароўя будуць больш цесна узаемадзейнічаць з міліцэйскім бюро рэгістрацыі няшчасных выпадкаў. Паводле слоў начальніка УУС Віцебскага аблвыканкама, палкоўніка Вячаслава Яўстаф'ева, толькі ў мінулым годзе ў віцебскае бюро рэгістрацыі няшчасных выпадкаў звярнуліся больш за 2360 грамадзян. Бюро працуе, пачынаючы з 2003 года. За гэты час былі афіцыйна аб'яўлены прапаўшымі без вестак 384 чалавекі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дом афармляецца па спрошчанай працэдуры

У вёсцы Порплішча Докшыцкага раёна застаўся дом маіх бацькоў, які быў пабудаваны прыкладна ў 1971 годзе. У 1994 годзе дом быў падараваны маёй дачцэ. У 2004 годзе бацькі памерлі. Ніякіх дзеянняў па афармленню і рэгістрацыі дома да 2004 года і пасля не ажыццяўлялася. Абавязковую страхоўку і іншыя выплаты рабілі і робім.

Сёння мы адшукалі людзей, якія маюць жаданне купіць дом. Адразу звярнуліся ў Порплішчанскі сельскі Савет з пытаннем аб афармленні продажу дома па спрошчанай працэдуры ў адпаведнасці з указам № 368. Аднак у сельскім Савеце адказалі, што продаж нашага дома нельга афармляць па спрошчанай працэдуры. Растлумачце, што нам рабіць? Якія павінны быць нашы дзеянні па афармленню дома пры плануемым продажы?

Галіна ТУРЧЫНОВІЧ, *г. Жодзіна.*

— Калі ў гэтай справе з вашай нерухомасцю няма больш ніякіх «падводных камянёў», то вы рабілі ўсё правільна, — лічыць **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Георгій КУЗНЯЦОЎ**. — У адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2005 года № 368 «Аб некаторых пытаннях адчужэння жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах» дагаворы куплі-продажу жылых дамоў, якія знаходзяцца ў сельскіх населеных пунктах і не зарэгістраваны ў тэрытарыяльных агенцтвах па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю, даныя аб якіх унесены ў пагаспадарчую кнігу сельскага выканаўчага камітэта да 19 сакавіка 1985 года і якія з гэтай даты не з'яўляюся прадметам куплі-продажу або мены, заключаюцца ў пісьмовай форме і падлягаюць рэгістрацыі ў сельскім выканаўчым камітэце.

Дзеянне сельскага выканаўчага камітэта можа быць абскарджана вамі шляхам падачы адпаведнай заявы ў вышэйстаячы выканаўчы і распарадчы орган або ў судовым парадку.

Сяргей КУРКАЧ.

«ШРОТ»

Рэха публікацыі

— так называўся артыкул Сымона Свістуновіча ў «Звяздзе» ад 11 лістапада мінулага года. Размова ішла пра падзеі, што адбыліся ў Ляхавіцкім лясгасе: падчас рэйду па выяўленню фактаў браканьерства быў паранены адзін з браканьераў, а таксама і егер. Сітуацыя разглядалася ў судовых інстанцыях.

Рэдакцыя атрымала ліст з Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь:

«Пасля апублікавання артыкула ў газеце «Звязда» ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь правераны матэрыялы крымінальнай справы ў дачыненні да асуджанага Бурчыца А.М.

Па прыгавору суда Ляхавіцкага раёна ад 3 лістапада 2006 года, які пакінуты без змянення касацыйнай інстанцыяй, Бурчыц А.М. асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму, з пазбаўленнем права займаць пасады егера ў сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь на 5 гадоў.

Ён прызнаны вінаватым у наўмысным учыненні службовай асобай дзеянняў, якія яўна выходзяць за межы правоў і паўнамоцтваў, што прадастаўлены яму па службе, з прымяненнем зброі.

Вінаватасць Бурчыца А.М. ва ўчыненні гэтага злачынства даказана і яго дзеянні па ч. 3 арт. 426 КК кваліфікаваны правільна.

Разам з тым, улічваючы, што Бурчыц учыніў незаконныя дзеянні пры непасрэдным выкананні сваіх абавязкаў — спыненні незаконнага палявання, характарызуецца станоўча, Вярхоўным Судом угледжаны падставы для прызначэння яму больш мяккага пакарання, чым прадугледжана законам за ўчыненае. Таму мною на прыгавор раённага суда ў прэзідыум Брэсцкага абласнога суда прынесены пратэст, у якім пастаўлена пытанне аб замене прызначанага асуджанаму пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на 4 месяцы арышту без пазбаўлення права займаць вызначаныя пасады або займацца вызначанай дзейнасцю.

З павагай В.Л. КАЛІНКОВІЧ, намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь».

Простыя рэчы

КАЖУХ

Баюся праявіць пэўную некампетэнтнасць, але выкажу сваё меркаванне. Сярод таго, што чалавек першым прыстасаваў сабе для адзення, акрамя нейкіх там раслін, былі, безумоўна, скуры забітых ім жывёлін. Як яны там выскрабаліся каменнымі скрабкамі, якімі там жыламі сшываліся таксама каменнымі іголкамі — але гэта былі скуры. Таму кажух бясспрэчна можа ганарыцца, што ў яго такія старажытныя, ледзь не ад пачатку існавання чалавецтва, папярэднікі.

Здаўна і ў беларусаў мужчынскі і жаночы кажух з аўчыны быў самай распаўсюджанай вопраткай. Асабліва ў зімовы час. Спачатку ён шыўся з нядубленых аўчын, потым з вырабленых. Як падаюць этнаграфічныя матэрыялы, у Беларусі пераважалі кажухі жоўта-карычнева-вохрыстага, вохрыста-цаглянага, радзей белага колераў. У XIX — пачатку XX стагоддзяў сфарміравалася тры групы кажухоў. **Прамога крою** — прамая суцэльная спіна, вялікі каўнер, апуха ішла ўздоўж крыса і па нізе. **Прыталены** — спінка адразалася, пярэдняя частка была ў зборкі. Апуха ішла па крысу, па нізе, па рукавах. **З «вусам»** — прыталены, знізу па баках клíны, так званыя вусы. У Беларусі славіліся мотальскія кажухі. Святочную вопратку ўпрыгожвалі тканінай, скурай, вышыўкай.

У нашым сямейным архіве ёсць фотаздымак зімы 1954 года. Маці з бацькам пад сцяной свайго дома, у які толькі восенню ўсяліліся. На бацьку даўгі, ледзь не да пят кажух з чорных аўчын. Нават на фотаздымку бачна, што выраб аўчын саматужны, далёка не лепшай якасці. Але ж кажух! Ніякая зіма не страшная. Дарэчы, крой, наколькі можна меркаваць, прамы. А гэта яшчэ і мамін пасаг. Яе бацька збіраў аўчыны, тады ў іхняй вёсцы яшчэ трымалі авечак, не адзін год. І вось пасля вяселля аддалі дачцэ. А тая палічыла неабходным справіць маладому мужу кажух — для мястэчка самая тая вопратка.

А яшчэ ж былі кажухі, пакрытыя сукном, іх даўней называлі **бармамі**. Слова **бармы** ёсць і ў рускай мове. Праўда, маюць яны іншае значэнне. Рускія цары перанялі ад візантыйскіх імператараў бармы, якія надзяваліся на плечы, яны былі аздобленыя малюнкамі рэлігійнага зместу, каштоўнымі камянямі. Надзяваліся яны толькі ў час каранацый альбо вельмі ўрачыстых выхадаў цара. Выкараніў іх у Расіі, відаць, рэфарматар Пётр I. Па крайняй меры ў рамане Аляксея Талстога гэтыя бармы вельмі мулялі цару на пачатку яго праўлення, ды і не пасавалі яго доўгай, нескладнай фігуры.

Ёсць у беларускай мове і словы **шуба, футра**. Але яны ўжо гавораць аб больш высокай якасці вопраткі, не з аўчын. Але ў народным побыце менавіта кажух з аўчын служыў верай і праўдай.

У паэме Якуба Коласа «Новая зямля», як толькі гаворка ідзе пра зімовы час — кажух сустракаецца вельмі часта.

І вось над хатай, над гуменцам
Сняжынкі жвавыя гуляюць,
Садок і дворык засцілаюць
Бялюткім, чыстым палаценцам..
І тут у хаце не ўтрываеш:
Кажух на плечы накідаеш,
Бяжыш на двор. Як той шалёны,
Крычыш, гукаеш здавалёны,
Зямлі не чуеш пад сабою
І ловіш белы снег рукою.

І паглядзіце, як простае, нават нязграбнае, як каму можа падасца, слова кажух натуральна пасуецца да пачуццяў, выкліканых прыходам першага снегу. Ці яшчэ:

На ім кучомка, верх зялёны,
Кажух кароценькі, чырвоны,
А стан шырокая папруга
Сціскае спрытна, лоўка, туга;
На меднай спронжцы лось красуе
І з жоўтай бляхаю фасуе,
А праз плячо паўзверх кажуха
Ідзе раменны пас бы ў зуха...

Гэта герой паэмы Міхал, ляснік на панскай службе, выпраўляецца ў абход свайго ўчастка. А паны ж палякі, таму ў апісанні форменных адзнак лесніка сустракаюцца польскія словы. Ды пераважае кажух, без якога ў лесе не абысціся. Ён кароткі, гэта дакладней **кажушок**, каб спрытней было хадзіць па снезе.

Успомніў. Некалі ў кнізе пра сваю салдацкую службу ў сямідзесятых гадах «Каменьчыкі ў кірзавым боце» пісаў і я пра кажух. У адной з навел ішла гаворка пра тое, як нясецца каравульная служба ў завіруху. Прыведу ўрывак:

«Падышлі да майго паста. Гэта склады арт і стралковага забеспячэння. Яны абнесены па перыметру двума радамі калючага дроту. Між іх і ходзіць вартавы, як той сабака без ланцуга. Ля ўваходу сігналізацыя. Але на званкі мой сябар, які цяпер стаіць на пасту, Фёдар Цапко, не рэагуе. Яшчэ звонім — Федзі няма.

Сяржант-развадзячы злуецца. Сваім ключом ён адмыкае металічную брамку, удвух ідзём па перыметру складоў. Ён, злуючыся, што вось мог бы ісці ў цёплае каравульнае памяшканне, я — што мне дзве гадзіны тупаць тут сярод начы і завірухі. Абыходзім усю загарадку за некалькі хвілін. Федзі няма. Сяржант, яшчэ не верачы, пытаецца ў тых, хто застаўся ля ўваходу: ці бачылі? Не.

Гэта ўжо не жарты. Склады адным са сваіх бакоў увогуле з'яўляюцца мяжой часці. Ды і дрот кругом высозны. Куды мог падзецца вартавы? Два чалавекі застаюцца ля ўваходу з аўтаматамі, у якіх адцягнуты затворы, а мы ўжо ўтраіх абягаем яшчэ раз склады. Федзі няма! А завіруха круціць, насміхаецца.

Сяржант пільна аглядае брамку ўнутранай агароджы складоў: усё на месцы, замкі, пячаткі. Ніхто на склад не залез. Знешнюю ж брамку можа адкрыць толькі ён.

— Пройдзем яшчэ раз.

Цяпер ідзём па маршруту вартавога асцярожна, асабліва сяржант, свецячы ліхтаром, аглядае дрот агароджы. І тут на адной з паваротак сяржант, загробшы ботам гурбіну, прыпыняецца. Мы таксама. Пачынаем разграбаць снег рукамі.

І вось ужо бачым кажух. Федзя!

Ён пад нашымі не надта далікатнымі дотыкамі варушыцца, нешта мармыча і ўрэшце прачынаецца, садзіцца ў снежным мярле.

Жывы. Злосць сяржанта ад аднаго гэтага знікае. Знаходзіцца ў снезе пад Федзем і аўтамат. Сяржант не «заложыць», ён таксама з маладых. А Федзя проста заснуў.

Кажух апранаю я. Калі падняць каўнер — вышэй за шапку, сам ён да зямлі. Заваліся ў снег — сапраўды можна заснуць. А праз паўгадзіны навальваецца гэта згрызотлівая спакуса: а сапраўды, чаму б не прылегчы, ці прысесці адпачыць. Ды толькі ўспамінаю, што на гэты склад былі спробы нападу. Зброя цікавіць многіх...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Паставах прыгожы гарадскі парк. Соснам тутэйшым далёка і далёка за сто гадоў. Здаўна гэту мясціну мясцовыя жыхары называюць «гарбаркай», нават цяпер, калі праводзяцца тут міжнародныя святы «Звіняць цымбалы і гармонік». Адкуль узялося слова? У польскай мове ёсць слова «garbowanie», што па-беларуску азначае дубленне. І сапраўды, ёсць звесткі, што яшчэ пры Тызенгаўзах, якія валодалі Паставамі, у гэтым месцы выраблялiся, дубіліся скуры. Адсюль і назва, якая захавалася праз стагоддзі.

Сённяшнія метады і тэхналогіі вырабу скур сягнулі далёка наперад. І цяперашнія кажушкі ўжо неяк і няёмка называць кажухамі. Прыдумалі для іх адпаведную назву — **дублёнкі**.

У нашу правінцыю масавая мода на дублёнкі прыйшла недзе ў сямідзесятых гадах. Але «дастаць» — характэрнае для таго часу слова — іх было практычна немагчыма. І вось у вядомым на ўсю рэспубліку калгасе імя Суворава разгарнуліся. Пачалі выраб скур і пашыў досыць прыстойных дублёнак. Але і іх на ўсіх жадаючых не хапала. Кіраваў гэтымі промысламі мой добры знаёмы Уладзімір Рабаконь. Сёння гэтай вытворчасці ў калгасе, прабачце, сельгаскааператыве ўжо няма. А вось у суворaўскіх дублёнках ходзяць многія пастаўчане. Служыць яна і мне.

Алесь КАСЦЕНЬ,
Віцебская вобласць.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

Атрыманы работнікам крэдыт, яго жыллёвыя ўмовы не маюць сувязі са змяненнямі працоўнага дагавора

Заяўніцу, якая патэлефанавала на «гарачую лінію» газеты з Дзяржынскага раёна (дакладныя звесткі маюцца ў рэдакцыі), летась у якасці падменнай даяркі ўзялі на працу ў адну з гаспадарак. «Пра тое, што часова, мяне ніхто не папярэдзіў. Нядаўна я была ў водпуску, а калі выйшла, высветлілася, што мяне быццам бы збіраюцца пераводзіць на іншую, з меншым заробкам, работу».

Пакуль ніякіх загадаў з гэтай нагоды жанчына не бачыла, аднак яна хвалюецца, паколькі мае не вельмі добрыя жыллёвыя ўмовы, адна выхоўвае дзіця школьнага ўзросту. А яшчэ, выходзіць, як на тую бяду, летась узяла спажывецкі крэдыт на 3 мільёны рублёў. Яго трэба вяртаць, выплачваць працэнты за карыстанне ім, таму, зразумела, заяўніца і нервуецца, што можа страціць сваю цяперашнюю працу.

— Пытанні вашай заяўніцы не зусім карэктныя, паколькі не зусім зразумела, пра што дакладна вядзецца гаворка: перавод, перамяшчэнне ці іншае, — патлумачыла нам начальнік упраўлення прававога забеспячэння і нагляду дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алена Камісарава. — Аднак пералічаныя жанчынай аргументы ніяк не могуць паўплываць на наймальніка, паколькі ён павінен кіравацца главой 3 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Змяненні працоўнага дагавора».

У прыватнасці, як паведаміла раней Алена Васільеўна, згодна з артыкулам 30 памянёнай главы, пераводам прызнаецца даручэнне наймальнікам работніку работы па іншай прафесіі, спецыяльнасці, кваліфікацыі, пасадзе (за выключэннем змянення наймення прафесіі, пасады) у параўнанні з абумоўленымі ў працоўным дагаворы, а таксама даручэнне работы ў іншага наймальніка або ў іншай мясцовасці (за выключэннем службовай камандзіроўкі). Перавод дапускаецца толькі з пісьмовай згоды работніка (за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкуламі 33 і 34 Кодэкса). Забараняецца перавод работніка на работу, процілаказаную яму па стану здароўя.

— Калі ж жанчына мела на ўвазе перамяшчэнне, дык, згодна з артыкуламі 31 Кодэкса, ім прызнаецца даручэнне наймальнікам работніку ранейшай работы на новым працоўным месцы як у тым жа, так і іншым структурным падраздзяленні, за выключэннем адасобленага, на іншым механізме ці агрэгаце, але ў межах спецыяльнасці, кваліфікацыі ці пасады з захаваннем умоў працы, абумоўленых працоўным дагаворам. Пры перамяшчэнні не патрабуецца згоды работніка, праўда, перамяшчэнне павінна быць абгрунтавана вытворчымі, арганізацыйнымі ці эканамічнымі прычынамі. Не дапускаецца толькі перамяшчэнне работніка на работу, процілаказаную яму па стану здароўя, — сказала Алена Камісарава.

У сувязі з абгрунтаванымі прычынамі наймальнік мае права змяніць істотныя ўмовы працы работніка пры працягванні ім работы па той жа спецыяльнасці, кваліфікацыі ці пасадзе, вызначаных у працоўным дагаворы. Істотнымі ўмовамі працы, згодна з артыкулам 32 Кодэкса, прызнаюцца сістэмы і памеры аплаты працы, гарантыі, рэжым работы, разрад, найменне прафесіі, пасады, устанаўленне ці адмена нядоўнага рабочага часу, сумяшчэнне прафесій і іншыя ўмовы. Наймальнік абавязаны папярэдзіць работніка аб змяненні істотных умоў працы пісьмова не пазней, чым за адзін месяц. Калі работнік адмовіцца працягваць работу ў сувязі са змяненнямі істотных умоў працы, працоўны дагавор, згодна з пунктам 5 артыкула 35 Кодэкса, можа быць спынены.

Можа разглядацца і варыянт з часовым пераводам у сувязі з вытворчай неабходнасцю (артыкул 33 Кодэкса). Такой неабходнасцю прызнаецца неабходнасць для дадзенага наймальніка папярэджання катастрофы, вытворчай аварыі ці хуткай ліквідацыі іх наступстваў і інш., а таксама для замяшчэння работніка, які адсутнічае. У выпадку вытворчай неабходнасці наймальнік мае права перавесці работніка на неабумоўленую працоўным дагаворам работу (па іншай прафесіі, спецыяльнасці, кваліфікацыі, пасадзе), а таксама на работу да іншага наймальніка. Часовы перавод у сувязі з вытворчай неабходнасцю адбываецца без згоды работніка на тэрмін да аднаго месяца (па ўзгадненню бакоў ён можа быць павялічаны). Часовы перавод у сувязі з вытворчай неабходнасцю ў іншую мясцовасць дапускаецца толькі са згоды работніка. Пры часовым пераводзе аплата працы адбываецца па рабоце, што выконваецца, але не ніжэй сярэдняга заробку на ранейшай рабоце.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«МЫ — МОСТ ПАМІЖ РАСІЯЙ І ЗАХАДАМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Гэта непакоіць не толькі мяне, але і кіраўніцтва ўсіх былых савецкіх рэспублік. Расія нас, былых рэспублік Савецкага Саюза, спрабуе не заўважаць, маўляў, яны ўсё роўна нікуды не падзенуцца і будуць «прышпілены» і далей да Расійскай Федэрацыі. Гэта — памылковая пазіцыя, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта падобна на нейкі разброд і хаос у арганізацыі знешнепалітычных памкненняў Расіі. Там няма нейкага стрыжня, вакол якога б развівалася адпаведная знешняя палітыка Расійскай Федэрацыі. Прычына гэтага — вялікія грашовыя рэсурсы, якія паступаюць у Расію ад продажу нафты, газу і іншых сыравінных рэсурсаў. Гэта ў нейкай ступені нівеліруе цяперашнюю палітыку цяперашняга кіраўніцтва Расіі. Але так будзе не заўсёды».

Расія павінна адмовіцца ад сваёй вялікадзяржаўнасці і спробаў глядзець на Беларусь звысоку, як на малодшага брата, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Я думаю, што знойдуцца жадаючыя кампаніі, якія паставяць у Беларусь нафту, з якімі мы прыватызуем і акцыянуем нашы нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, сёння на беларускіх прадпрыемствах вырабляюцца самыя сучасныя віды паліва, якія рэалізуюцца ў Еўропе. «Там не проста збыць паліва — яно павінна быць самага высокага класа», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Таму знойдуцца кампаніі, якія прыйдуць на нашы прадпрыемствы са сваёй нафтай, але гэта будзе самая вялікая небяспека для Расіі. Таму што гэта прывядзе да страты ёю традыцыйных еўрапейскіх рынкаў, высокадаходных для Расіі», — дадаў ён.

Аднак Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што да такіх «вострых варыянтаў развіцця падзей» справа не дойдзе. «Я ўпэўнены, што Расія вернецца да тых прынцыпаў супрацоўніцтва з Беларуссю, на якіх яно ў нас будавалася. Мы гатовы да гэтага супрацоўніцтва ў любы дзень і час. Думаю, што ўзровень добрасуседскага супрацоўніцтва, а гэта ў інтарэсах і ўсёй Еўропы, паміж Беларуссю і Расіяй захаваецца», — адзначыў Прэзідэнт.

Беларусь не мяняе кардынальна знешнепалітычны курс, заявіў кіраўнік дзяржавы.

Каментуючы нядаўнія выказванні аб неабходнасці паляпшэння адносін Беларусі і Захаду, Прэзідэнт падкрэсліў: «Гэта не кардынальнае змяненне курсу беларускага кіраўніцтва, як некаторыя ў Расіі спрабуюць гэта ацаніць. Беларусы і расіяне — гэта практычна адзін народ. Адсюль і наша палітыка, мы гатовы ў гэтым напрамку дзейнічаць. Але мы не пацерпім ніякага націску і хлусні ў нашых адносінах з Расіяй».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь «даўно прапанавала Захаду канкрэтныя сферы супрацоўніцтва». «Але Захад да нядаўняга энергетычнага канфлікту быў глухі і нямы адносна нашых ініцыятыў. Прычына таго — інэртнасць еўрапейскай палітычнай машыны і адсутнасць жадання ўбачыць сапраўдныя працэсы ў Беларусі. Прыязджаюць сюды еўрапейскія чыноўнікі сярэдняй рукі, якія высока аплачваюцца, сустракаюцца з апазіцыяй і едуць дадому, не жадаючы турбавацца і вывучаць сітуацыю ўнутры Беларусі», — растлумачыў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, Захад сёння супрацоўнічае «нават не з апазіцыяй, а з кучкай адшчапенцаў, якія не адбыліся як члены каманды Прэзідэнта Лукашэнкі». «Усе яны некалі былі ў маёй камандзе і прытрымліваліся адной і той жа ідэалогіі, але атрымалі вельмі маленькія партфелі, таму пайшлі ў апазіцыю і сёння на гэтым зарабляюць грошы. Гэта іх бізнэс. Ім камфортна атрымліваць грошы ад Захаду за сваю апазіцыйнасць, Захаду камфортна сустракацца з імі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Тэмпы росту эканомікі і сацыяльная абароненасць у Беларусі будуць забяспечаны, чаго б гэта ні каштавала, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Паводле яго слоў, даныя за студзень і пачатак лютага бягучага года пацвярджаюць выкананне запланаваных тэмпаў росту.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што тую «дзірку», якая можа ўтварыцца ў выніку павышэння Расіяй цэн на газ і нафту, «мы закрыем паніжэннем рэнтабельнасці прадпрыемстваў, аказаннем падтрымкі насельніцтву і, калі трэба, прадпрыемствам за кошт бюджэту, знешніх інвестыцый». Акрамя таго, у нашай рэспублікі ёсць рэзервы росту цэн на прадукцыю, якая прадаецца на знешніх рынках іншым разам у разы танней за аналагічную заходнюю.

«Ад павышэння цэн на прыродны газ і нафту наша эканоміка страціць прыкладна $5 млрд за год. Калі, дапусцім, наш валавы ўнутраны прадукт вылічыць у $50 млрд, то $5 млрд — гэта 10 працэнтаў ВУП, якія Расія выключыць з нашай эканомікі», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама выказаў перакананасць, што, нягледзячы на гэта, Беларусь захавае тэмпы эканамічнага росту.

Беларусь мае намер кампенсаваць тыя $5 млрд, якія эканоміка страціць ад росту цэн на расійскія нафту і газ.

«Прэзідэнт Пуцін нядаўна сказаў, што Расія хоча пабудаваць рыначныя адносіны з усімі краінамі, у тым ліку і з Беларуссю. Прытрымліваючыся гэтага прынцыпу, мы таксама прапануем Расіі заплаціць за ўсе тыя паслугі, якія Беларусь аказвала ёй бясплатна. Гэта транзіт, ваеннае супрацоўніцтва, Калінінград, паўтары тысячы кіламетраў мытнай граніцы, ахова нашых граніц. Усё гэта дорага каштуе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, «за транзіт газу Польшчы Расія плаціць $4,5 млрд, а нам толькі $300 млн. Толькі па газу, калі ўзяць польскі варыянт, мы можам кампенсаваць усе нашы страты».

«Больш за ўсё нас засмучае пазіцыя нашага саюзніка псіхалагічна. Нам больш за ўсё крыўдна тое, што такія дзеянні распачала краіна — наша саюзніца, самая блізкая нам краіна, дзе жыве самы блізкі нам народ. Але можа гэта і да лепшага», — сказаў Прэзідэнт.

«Мы рыхтуем адпаведныя праекты пагадненняў, якія накіруем у бліжэйшы час Расіі. Зробім гэта спакойна, як і належыць пры рыначных адносінах», — дадаў беларускі лідар.

Беларусь заўсёды хацела наладзіць адносіны з Захадам, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Асобныя палітыкі ў Расіі сталі гаварыць, што Лукашэнка, маўляў, просіцца на Захад. Мы даўно гаворым, што нам трэба нармалізаваць адносіны. У гэтым сутнасць, а не ў тым, што з-за канфлікту з РФ мы павярнуліся на Захад. Я прызнаю недахоп нашай знешняй палітыкі, што яна атрымалася адналатэральнай, з вектарам у бок Расіі. Мы стаялі на адной назе, а павінны стаяць на дзвюх. Мы знаходзімся паміж Захадам і Расіяй. Мы мост паміж Расіяй і Захадам», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, толькі ў выніку нядаўняга беларуска-расійскага крызісу «Еўропа зразумела: без Беларусі цяжка забяспечыць энергетычную бяспеку, і што Беларусь, аказваецца, хоча захаваць суверэнітэт. І гэта было сюрпрызам для Еўрапейскага саюза».

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што Беларусь даўно прапанавала еўрапейцам сферы і шляхі супрацоўніцтва, якія «вывелі б на ўзровень добрых суседзяў».

«Але калі мы гаварылі еўрапейцам: давайце сядзем за стол перагавораў і будзем абмяркоўваць нашы адносіны, Еўропа, ідучы на повадзе ў апазіцыі, закрыла ўезд нашым палітыкам, пад надуманымі прычынамі вырашыла выключыць нас з аб'яднанай сістэмы прэферэнцый. Як можна было наладжваць адносіны з Еўрапейскім саюзам? Гэта падобна на палітыку Расіі. Накінулі пятлю на шыю і гавораць: давайце будаваць Саюзную дзяржаву. З пятлёй на шыі. Але нас немагчыма зламаць, і на калені нас ніхто не паставіць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, Беларусь знаходзіцца ў цэнтры цывілізаванага свету. «І еўрапейцы, як цывілізаваныя людзі, вымушаны будуць прызнаць, што ў беларусаў ёсць такія ж нацыянальныя інтарэсы, як у немцаў, англічан, французаў, чэхаў, палякаў, украінцаў. Мы гаворым: давайце будзем дагаворвацца, і вы ўбачылі б, што Беларусь — гэта такі партнёр, лепш за якога немагчыма жадаць. Толькі пры гэтым не стаўце перад намі невыканальныя ўмовы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў: «Патрабаванні да Беларусі, у канчатковым выніку, зводзіліся да таго, што мы павінны разбурыць нашу палітычную сістэму, па-першае, і, па-другое, усюды мелася на ўвазе, што цяперашні Прэзідэнт Беларусі нелегітымны, і ён павінен пайсці са сваёй пасады. Якое права мае Захад патрабаваць гэтага?».

Прэзідэнт Беларусі ў час інтэрв'ю заявіў, што збіраецца захаваць як асабліваць нашай эканомікі высокую ступень абароненасці людзей. Разам з тым Беларусь не будзе знаходзіцца на абочыне суветнага развіцця.

Гаворачы аб эканамічнай мадэлі Беларусі, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што для нашай краіны характэрна высокая ступень сацыяльнай абароны насельніцтва. «Калі мець на ўвазе тую найвышэйшую ступень сацыяльнай абароны нашага насельніцтва, тыя сродкі, якія мы ўкладваем у адукацыю, навуку, ахову здароўя, то гэту эканоміку, гэту палітыку можна назваць у нейкай ступені сацыялістычнай. Да гэтага можна аднесці і той узровень прагназавання і планавання, які ўласцівы нашай эканоміцы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым, адзначыў Прэзідэнт, у нашай краіне бесперашкодна развіваецца прыватная ўласнасць, абсалютна свабодны фінансавы рынак, рыначныя адносіны, што характэрна для капіталістычнай эканомікі. «Гэта значыць, мы абсалютна ўсведамляем, у якім напрамку развіваецца свет. І мы не збіраемся быць на абочыне гэтага развіцця. Мы абавязкова будзем мець тую эканоміку, якая прызнана ва ўсім свеце. Але пры гэтым захаваем асабліваць нашай эканомікі — найвышэйшую ступень абароненасці людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што роля дзяржавы ў эканоміцы яшчэ значная, нягледзячы на наступовы адыход ад цвёрдага кіравання ёю. «Калі б дзяржава ў свой час пайшла з эканомікі, мы б сёння мелі прыкладна той развал, які характэрны, напрыклад, для некаторых краін былога сацлагера. Калі дзяржаўнае прадпрыемства выробляе канкурэнтаздольны прадукт, то навошта нам прыватызаваць яго або разбураць нейкім чынам? Дзяржава павінна дакладна ажыццяўляць маніторынг, назіраць за працэсамі, якія адбываюцца на гэтых прадпрыемствах, і ў выпадку немагчымасці кіраванне перадаць яго ў прыватныя рукі, гаспадару, калі гэта трэба будзе», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка сярод прычын росту эканомікі адзначыў яе мадэрнізацыю за кошт уласных рэсурсаў. Пры гэтым, паводле слоў Прэзідэнта, у працэсе яе рэфармавання Беларусь не «кінулася ў вір прыватызацыі», і тым самым рэспублікі ўдалося зберагчы сваю эканоміку ад крыміналізацыі.

«У самім працэсе рэфармавання наша прыватызацыя, дапусцім, у адрозненне ад расійскай, мела кропкавы характар. Мы не ўсё разам, не агулам прыватызавалі дзяржаўную ўласнасць. Дзяржава адмаўлялася ад валодання і кіравання толькі тымі прадпрыемствамі, з якімі не магла справіцца. Пры гэтым мы выпрацавалі дзесятка паўтара ўмоў для будучых інвестараў. І галоўнае з іх — каб на прыватызаваным прадпрыемстве захаваўся працоўны калектыў і тыя сацыяльныя льготы і гарантыі, якія існавалі да гэтага», — заўважыў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў, што сёння прыватныя прадпрыемствы даюць пераважны працэнт ВУП — больш за палавіну.

«Галоўнае ў тым, што мы ішлі ад жыцця, ад практыкі. Мы развівалі сваю вытворчасць, арыентуючыся на свае ўнутраныя магчымасці і на патрэбы нашага чалавека. Мы пачалі мадэрнізаваць сваю эканоміку за кошт унутраных рэсурсаў, за кошт уласных сродкаў. Таму сёння мы фактычна не маем даўгоў перад Захадам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Знешні націск на Беларусь выкліканы палітыкай нашай рэспублікі, якая адрозніваецца ад палітыкі ў заходніх і балтыйскіх краінах.

«Але гэта наш выбар. Дайце нам магчымасць такім чынам жыць. Мы абавязкова вырулім на тыя рэйкі, па якіх рухаецца ўвесь свет. Аднак нам патрэбны час», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«У нас зусім іншая сітуацыя, чым у Германіі або ў Вялікабрытаніі — краіне з векавымі традыцыямі, не разбуранай вайной, дзе ўжо ўсё ўстаялася. А Беларусь чарговы раз на рубяжы 90-х гадоў аказалася поўнасцю разбуранай, і нам яшчэ сёння даводзіцца выходзіць з гэтага стану. Таму мы вымушаны, часам, за кошт жорсткіх кіраўніцкіх рашэнняў, выбірацца з гэтай «ямы», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў Беларусі працуе шмат заходніх бізнэсменаў, якія не пабаяліся прапаганды на Захадзе і стварылі тут свае прадпрыемствы. «Я з імі часта сустракаюся. Калі ў іх пытаюся, чаго ім не хапае, яны просяць толькі захаваць стабільнасць і кіруемасць, парадак, якія існуюць у краіне. Гэтыя заходнія бізнэсмены стварающь расткі будучай беларускай эканомікі», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы назваў міфам выказванні аб тым, што беларускае грамадства нібыта з'яўляецца закрытым. «У нас вельмі адукаваны народ. У Беларусі свабодна прадаюцца зацятыя апазіцыйныя газеты. Наша краіна «прастрэльваецца» ў інфармацыйным плане замежнымі сродкамі масавай інфармацыі. Самая вялікая бяда нашай апазіцыі ў тым, што іх апазіцыйнасць — гэта іх бізнэс. Яны разумеюць, што ўладу ў Беларусі ніколі не заваююць. Пазіцыянуючы сябе на Захадзе як апазіцыя, яны атрымліваюць дзесяткі мільёнаў долараў, дзеляць гэтыя грошы і бязбедна існуюць. Што, гэта народ не бачыць?» — сказаў Прэзідэнт.

Кар. БЕЛТА.

Ва ўрадзе

Дасягнута прынцыповая згода аб візіце прэзідэнта Ірана ў Беларусь

Аб гэтым паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусі Абдольхамід Фекры на прэс-канферэнцыі ў Мінску, прымеркаванай да нацыянальнага свята Ірана.

Дыпламат адзначыў, што ў час візіту будзе падпісаны шэраг важных двухбаковых дагавораў, якія датычацца рэалізацыі сумесных праектаў. Адносна тэрмінаў візіту пасол удакладніў, што ён адбудзецца ў іранскім новым годзе, які настане 21 сакавіка.

Іран прадаставіў Беларусі нафтавае поле для разведкі і здабычы нафты, паведаміў Абдольхамід Фекры. У ліку сумесных праектаў, якія цяпер эфектыўна рэалізуюцца, пасол назваў зборку ў Беларусі іранскіх аўтамабіляў «Саманд». Іран гатовы разгледзець магчымасць удзелу ў стварэнні АЭС на тэрыторыі Беларусі, калі адпаведная прапанова паступіць ад беларускага боку. Абдольхамід Фекры адзначыў, што цяпер прадстаўнікі беларускай банкаўскай сферы знаходзяцца з візітам у Іране.

БЕЛТА.

Сяргей Сідорскі прапануе распрацоўваць бюджэт Беларусі на два гады

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі прапанаваў распрацоўваць бюджэт Беларусі на два гады. Як адзначыў кіраўнік урада на калегіі Міністэрства фінансаў, «трэба ісці да доўгатэрміновага бюджэту».

У цэлым Сяргей Сідорскі станоўча ацаніў работу фінансавых органаў Беларусі ў 2006 годзе.

Кіраўнік урада прызнаў неабходнасць змянення заканадаўства для больш актыўнага функцыянавання рынку дзяржаўных і карпаратыўных каштоўных папер. «І гэта павінен рабіць камітэт па каштоўных паперах. Ён павінен працаваць, а не ствараць ілюзіі і гаварыць аб палітычных рызыках», — сказаў Сяргей Сідорскі. На яго думку, «сёння мы можам атрымаць столькі грошай, колькі ёсць бізнэс-планаў, пад добры бізнэс-план развіцця заўсёды знойдуцца фінансавыя сродкі». Прэм'ер-міністр заклікаў Мінфін наладзіць дакладную і сістэмную работу. Ён адзначыў, што грошы, атрыманыя ад прыбытку высокадаходных і эфектыўных галін, будуць накіроўвацца на інавацыйныя праекты ў іншых сферах, а таксама на невялікіх прадпрыемствах, якія самі не могуць прыцягнуць пазыковыя сродкі.

«Цяпер дзесяткі буйнейшых замежных банкаў прапануюць рэсурсы нашай краіне», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі. Паводле яго слоў, на гэты год стаіць задача выйсці на прыцягненне знешніх рэсурсаў у бюджэт Беларусі ў памеры каля $1,5 млрд. «Я думаю, што ў сакавіку ў нас павінна быць як мінімум $500 млн нязвязаных крэдытаў, прадастаўленых пад эфектыўныя праекты», — сказаў ён.

У Беларусі дадатковыя паступленні мясцовых бюджэтаў у 2007 годзе за кошт максімальнага выкарыстання незадзейнічаных крыніц могуць скласці больш як Br680 млрд. «Калі чалавек хоча пабудаваць катэль, рэстаран або іншы аб'ект, ён павінен звяртацца непасрэдна да мясцовых органаў улады. Чаму свабодныя землі не прапаноўваюцца праз аўкцыёны, таргі? Калі чалавек гатовы ўкласці грошы, не трэба яму перашкаджаць, паколькі гэтыя грошы будуць заставацца на развіццё мясцовых і сярэдніх гарадоў», — падкрэсліў кіраўнік урада. Акрамя таго, лічыць Сяргей Сідорскі, мясцовыя бюджэты шмат страчваюць у выніку недастаткова эфектыўнай работы ў сферы паслуг.

БЕЛТА.

САБАКІ СТАРШЫНІ — СТРЭЛ ЕГЕРА

У прыватнай паляўнічай гаспадарцы «Ярэміцкае» Кобрынскага раёна інспектары і супрацоўнікі міліцыі знайшлі ў лесе забітага дзіка. Пазней высветлілася, што звера загналі сабакі старшыні мясцовага аб'яднання паляўнічых і рыбаловаў, а застрэліў яго егер. А ўся праблема ў тым, што дзік быў забіты без ліцэнзіі і з парушэннем умоў паляванне. Праводзіцца разбор справы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Акадэмічны погляд на «энергетычную праблему»

Учора, 7 лютага, адбылося пасяджэнне сесіі Агульнага сходу Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі, на якім разглядаліся вынікі дзейнасці акадэміі летась і задачы на бліжэйшую будучыню. Адной з галоўных тэм стала сітуацыя ў энергетыцы краіны.

Паводле слоў старшыні Прэзідыума НАН Міхаіла Мясніковіча, сёння «галоўная задача акадэмічнай супольнасці ў галіне энергабяспекі — выпрацоўка канкрэтных мераў, абгрунтаваных праектаў і прапаноў». Так, летась група навукоўцаў правяла даследаванне 31 прадпрыемства краіны і прапанавала варыянты зніжэння энергаспажывання на гэтых прадпрыемствах ад 10 да 70 працэнтаў ад сённяшняга ўзроўню энергаспажывання. «Трэба прадоўжыць гэтую працу, дайсці да кожнага завода, кожнай вытворчасці... Эканомія і беражлівасць з'яўляюцца залогам нацыянальнай бяспекі».

Міхаіл Мясніковіч заявіў таксама, што НАН падрыхтавала тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне арганізацыі вытворчасці маторных паліваў і метанолу з бурага вугалю і торфу ў Беларусі. «Інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны» чакае велізарная праца па навуковаму забеспячэнню работ па будаўніцтву атамнай электрастанцыі».

У 2007 годзе, паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, НАН павінна ўдзяліць «асаблівую ўвагу пытанням эканоміі і рацыянальнага выкарыстання сродкаў» у сувязі з ростам тарыфаў на электрычную і цеплавую энергію. У прыватнасці, на працягу года «ўсе 146 юрыдычных асобаў НАН (многія з іх маюць па некалькі будынкаў) павінны абсталяваць усе аб'екты сродкамі ўліку электрычнай і цеплавой энергіі, вады, рэалізаваць энергазберагальныя мерапрыемствы».

Гаворачы пра дзейнасць НАН па прыцягненню і замацаванню ў інстытутах акадэміі маладых кадраў, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што зараз колькасць даследчыкаў ва ўзросце да 29 гадоў складае 21 працэнт. «Паказчык амаладжэння кадраў усяляе ўпэўненасць, бо ў 2002 годзе было ўсяго 14 працэнтаў маладых людзей».

Старшыня Прэзідыума НАН паведаміў, што зараз рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій з'яўляюцца 16 кампаній. З арганізацыі НАН свае бізнэс-праекты ў Парку зарэгістравалі Нацыянальны цэнтр інфармацыйных рэсурсаў і тэхналогій, інстытуты электронікі і парашковай металургіі.

Звяртаючыся да тэмы міжнароднага супрацоўніцтва, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што «калі мы гаворым пра адкрытую эканоміку, то маем на ўвазе магчымасць замежных кампаній удзельнічаць у рэалізацыі беларускіх праектаў. Пакуль навуковая сфера, у адрозненне ад усіх астатніх сфер нашай краіны, з'яўляецца закрытай. І ўсе конкурсы, тэндэры, экспертызы навукова-даследчага характару ідуць паміж беларускімі арганізацыямі. Гэта дрэнна. Няма канкурэнцыі. З 2007 года гэтую практыку трэба мяняць».

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Анатоль Рубінаў адзначыў падчас свайго выступлення на пасяджэнні ў НАН, што «зараз, калі Расія падняла для нас цэны на газ і нафту, навука набывае асаблівае значэнне. Краіна чакае ад навукоўцаў абгрунтаваных рэкамендацый, новых распрацовак, накіраваных на больш рацыянальнае выкарыстанне энергарэсурсаў, якія маюцца, і пошук іх новых крыніц».

На думку Анатоля Рубінава, Расія, павышаючы цэны на газ і нафту, «паступіла ў адносінах да Беларусі не па-саюзніцку, не па-сяброўску і не па сумленню. Дакладней, не Расія, а яе кіраўніцтва».

«Расія нясе гістарычную адказнасць перад Беларуссю. Не Беларусь, а савецкае кіраўніцтва, Крэмль прымаў рашэнне па развіццю ў нас прамысловасці, магутнасці якой былі разлічаны не на нашу маленькую рэспубліку, а на вялікую агульную моцную дзяржаву. Беларусь ніколі не стала б узводзіць такую велізарную прамысловасць, калі б хоць на хвіліну засумнявалася ў тым, што яна стопрацэнтна будзе забяспечвацца энергарэсурсамі з расійскага боку... Калі Савецкі Саюз распаўся, Беларусі даталася велізарная цяжкапад'ёмная прамысловасць, а Расіі — усе энергарэсурсы. Хіба гэта справядліва?» — сказаў Анатоль Рубінаў. Пры гэтым ён дадаў, што пры цывілізаваным «разводзе» дзвюх краін пасля распаду Савецкага Саюза Беларусь павінна была атрымаць доступ да здабычы нафты і газу ў аб'ёме, які б вылічваўся зыходзячы з таго, якое месца эканоміка краіны займала ў агульнай гаспадарцы Савецкага Саюза.

Анатоль Рубінаў заявіў таксама, што «калі б Расія сама пераходзіла на сусветныя цэны на энергарэсурсы для сваіх прадпрыемстваў, то было б абсалютна апраўданым адпаведнае павышэнне цэн для нас. Але яна гэтага не робіць... Там што, не разумеюць, што прадпрыемаемыя крокі з'яўляюцца не пераходам на рынкавыя ўзаемаадносіны паміж нашымі краінамі, а спробай задушэння нашай эканомікі? Разумеюць. А для чаго так робяць? Расія ясна на гэтае пытанне адказаць не можа. Адштурхне яна ад сабе Беларусь, прымусіць яе больш інтэнсіўна рухацца да Захаду — хто ад гэтага выйграе? Безумоўна, не Расія».

«Будзем спадзявацца, што напружанасць, якая ўзнікла ў беларуска-расійскіх адносінах, пойдзе нам на карысць, бо прымусіць больш эфектыўна займацца павышэннем эфектыўнасці працы ўсёй нашай дзяржавы. Больш за тое, сітуацыя, якая склалася, яшчэ больш падкрэсліла каштоўнасць суверэнітэту Беларусі. Непрыхаваная эканамічная агрэсія з боку Расіі, спроба сілай прымусіць Беларусь увайсці ў склад Расіі прывялі да адваротнага эфекту», — дадаў Анатоль Рубінаў.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

НА РЫНКУ ЖЫЛЛЯ ЧАКАЮЦЦА ЗМЕНЫ...

Арэнда сталічнага жылля можа патаннець

Такое меркаванне выказаў карэспандэнту «Звязды» начальнік аддзела арэнды агенцтва нерухомасці «Час-Пік» Сяргей Кадол.

У апошні час здыманне кватэр у буйных гарадах краіны стала даволі масавай з'явай. Больш за астатніх «прасунутым» у гэтым накірунку стаў Мінск. Паводле падлікаў розных спецыялістаў, сёння здымаюць кватэры, пакоі, дамы, часткі дамоў у сталіцы дзесяткі тысяч чалавек. Паводле звестак начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі камітэта будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Мікалая Кома, толькі за апошні год колькасць «чаргавікоў» у сталіцы павялічылася амаль на 29 тысяч сем'яў. Так, на пачатак гэтага года на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінску стаіць каля 185 тысяч сем'яў і адзінокіх грамадзян. Вядома, што не ўсе яны здымаюць кватэры. Разам з тым вядомыя прыклады, калі іншагароднія студэнты пасля заканчэння ВНУ заставаліся ў сталіцы, дзе ўжо здымаюць жыллё гадоў 10 і больш. Здымаюць жыллё маладыя сем'і, якія вырашылі жыць асобна ад бацькоў; мужчыны пасля разводаў, тыя прыезджыя, хто адшукаў добрую працу ў Мінску, але не мае тут жылля, і шмат хто яшчэ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На рынку «часовага» жылля галоўным фактарам з'яўляецца кошт арэнды. Ад чаго залежаць яго памеры? Пры стандартным падыходзе да арэнды звычайнай тыпавой кватэры цана паслугі залежыць ад стану жылля, мікрараёна адрасата, наяўнасці ў «двух кроках» метро і галоўнае, ад таго, хто здае гэтае памяшканне. Для сярэдняга «спажыўца» кватэр яна павінна быць чыстай, утульнай і цёплай, але не больш таго. За «хрушчоўку» нават з еўрарамонтам мала хто будзе згодзен плаціць вялікія грошы.

Паводле звестак Сяргея Кадола, самыя танныя аднапакаёўкі здаюцца сёння па 160—170 долараў плюс камунальныя паслугі. Сярэдні кошт аднапакаёўкі каля 180 USD. У цэнтры Мінска магчыма адшукаць невялікую кватэру. Напрыклад, каля кінатэатра «Кастрычнік» невялікая кватэра будзе каштаваць 230—250 долараў. З другога боку, у Заводскім раёне, Шабанах і Чыжоўцы магчыма адшукаць жыллё на 10 долараў танней за мінімальную рысу.

Сярэдні кошт арэнды двухпакаёвых кватэр вагаецца ў межах 220 долараў. Мінімальная цана слабенькіх «двоек» пачынаецца з 200 долараў. Трохпакаёвыя «хрушчоўкі» пачынаюць свой «цэннік» з 230—240 долараў, а сярэдні кошт арэнды такіх кватэр дасягае 250—280 USD.

Эксперт агенцтва нерухомасці «Час-Пік» лічыць, што сёння цэны на арэнду канчаткова стабілізаваліся. Нагадаю, што летась у жніўні ў сталіцы назіраўся магутны скачок кошту арэнды, калі аднапакаёвыя кватэры прапанаваліся мінімум за 190—200 долараў.

Даволі стабільным попытам карыстаюцца сёння ў бескватэрных жыхароў сталіцы асобныя пакоі. Арэнда пакоя ў звычайнай тыпавой кватэры каштуе зараз 70 долараў. Здымаюць пакоі або маладыя сем'і, у якіх не хапае грошай для арэнды кватэры, ці адразу 2—3 студэнты.

Вядома, што ўсіх цікавіць, якім будзе кошт арэнды жылля ў бліжэйшай перспектыве. Колькасць прапаноў па арэндзе жылля застаецца на леташнім узроўні, але... Гэтай зімой пачалося павелічэнне кошту камунальных паслуг. З гэтай нагоды эксперты рынку жыллёвай нерухомасці разлічваюць, што зараз кватэры, якія раней сталі пустымі, сёння абавязкова трапяць на рынак арэнды. Існуе яшчэ адзін момант. Зараз у Мінску ў разы скарацілася колькасць кватэр, якія прапануюцца гаспадарамі на продаж. Калі кватэры нават у перспектыве прадаваць не будуць, тады такое жыллё пачне ўцягвацца ў абарот арэнды.

Спецыялісты другаснага рынку арэнды жылля добра ведаюць яшчэ адзін сезонны фактар. Бліжэй да лета немаладыя ўласнікі жылля пачнуць здаваць свае кватэры, бо самі будуць жыць у дачных пасёлках.

Усе гэтыя фактары разам павінны прывесці да істотнага павелічэння прапаноў кватэр у сегменце арэнды. У гэтым выпадку, па законах эканамічнай гульні, кошт арэнды павінен знізіцца. Аднак гэта залежыць і ад таго, якім будзе попыт на арэнду жылля.

Самымі лепшымі кліентамі для гаспадароў дарагіх кватэр з'яўляюцца замежныя грамадзяне, якія працуюць у міжнародных карпарацыях і дыппрадстаўніцтвах. Такія кватаранты здымаюць жыллё класа еўрастандарт прыкладна за 1000 USD у месяц. Кватэры здаюцца з усімі выгодамі, бытавой тэхнікай і іншымі «прынданаламі». У такія кватэры кліент засяляецца толькі з уласнай зубной шчоткай і адзеннем, а ўсё астатняе там ужо ёсць, нават кухонны посуд.

Зараз агенцтвы нерухомасці наладзілі яшчэ адну паслугу — арэнду катэджаў у прыгараднай зоне. Сярэдняя цана тыпавых катэджаў вагаецца каля 800 долараў, а вось элітныя «фазэнды» з усімі «наваротамі» здаюцца ўжо за 1,5—3 тысячы USD.

Сяргей КУРКАЧ.

Напіўся і пайшоў страляць... па дзіцячаму садку

П'яны хуліган, узброены паляўнічым ружжом, моцна напалохаў вёску Пінкавічы Пінскага раёна.

Зламыснік стрэліў прама ў акно дзіцячага садка. Дзверы перазарадзіў ружжо і стрэліў яшчэ раз. Пасля гэтага 50-гадовы хуліган пакінуў зброю дома і накіраваўся да сваёй сужыцелькі. Там яго і затрымала аператыўная група. У дзіцячым садку, на шчасце, ніхто не пацярпеў. Ад стрэлаў разляцелася на шматкі вонкавае шкло ў акне малодшай групы на другім паверсе. Унутранае шкло засталося цэлым. Самыя маленькія выхаванцы дзіцячага садка абедалі, калі трэснула і пасыпалася на кавалкі шыба ў акне.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Пінскага РАУС Валянцін Чарнарук, грамадзянін затрыманы па падазрэнню ў здзяйсненні злоснага хуліганства, з'яўляецца жыхаром Пінкавічаў. Гадоў дзесяць таму ён быў асуджаны таксама за злоснае хуліганства. Апошнім часам мужчына нідзе не працаваў і вёў асацыяльны лад жыцця. Дазволу на захаванне зброі ў яго не было.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У суд Ленінскага раёна г. Гродна паступіла заява аб прызнанні памерлым грамадзяніна **Сталбова Дзмітрыя Міхайлавіча,** 1975 года нараджэння, ураджэнца г. Гродна, апошняе месца жыхарства: г. Гродна, вул. Дамброўскага, д. 63, кв. 129. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Д.М. Сталбова, паведаміць іх суду Ленінскага раёна г. Гродна (вул. Даватара, 2/1) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява ад прызнанні адсутным без вестак **Савіна Ігара Валянцінавіча,** 7 снежня 1966 года нараджэння, ураджэнца і жыхара Рэспублікі Казахстан, гор. Цімертау, вул. Чарнышэўскага, дом 95, кв. 66, які ў 2001 годзе выбыў у невядомым напрамку і яго месцазнаходжанне невядома. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць нейкія звесткі пра І.В. Савіна, паведаміць іх суду Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ІРАКУ ПРАПАЛІ СОТНІ ТОН ДОЛАРАЎ

Старшыня камітэта па нагляду ЗША Генры Уоксман паведаміў, што за 13 месяцаў, з моманту стварэння ў Іраку часовага ўрада да моманту перадачы ўлады мясцовым уладам, Вашынгтон перапраўіў у Ірак 360 тон наяўных. «Хто ў здаровым розуме можа адправіць 360 тон грошай у зону баявых дзеянняў? Але менавіта гэта і было зроблена», — сказаў ён звяртаючыся да Пола Брэмэра, які ўзначальваў часовы ўрад Ірака.

На слуханнях у галоўным камітэце палаты прадстаўнікоў па нагляду дэмакраты запатрабавалі тлумачэнняў ад Брэмэра, які кантраляваў выдаткі на аднаўленне краіны. На гэтыя мэты было выдаткавана 12 млрд долараў наяўнымі. Як паведамляе The Financial Times, часам мяхі з грашыма разгружаліся прама з грузавікоў. Міжнародныя назіральнікі, у тым ліку спецыялісты Міжнароднага валютнага фонду, не раз папракалі ЗША за бескантрольнасць расходавання гэтых сродкаў. У запісцы, апублікаванай Уоксманам, прыводзяцца словы аднаго з супрацоўнік

Напярэдадні

ХТО ЗАСМЯЕЦЦА АПОШНІМ?

Беларускі тэнісіст трэніруе сапернікаў, а шведскі капітан піша музыку

Заўтра ў Мінску адбудуцца першыя сустрэчы 1/8 фіналу розыгрышу Кубка Дэвіса. Напярэдадні прайшлі прэс-канферэнцыі з удзелам шведскай і беларускай зборных. Сапернікі былі вельмі аптымістычнымі, сказалі, што галоўнае для іх — пакінуць Беларусь з «усмешкай на вуснах». Падтэкст гэтых слоў зразумелы: дружына Матса Віландэра плануе выйграць у падначаленых Дзмітрыя Татура. У чым сіла шведскіх ракетак, падзяліўся першы нумар беларускай каманды Максім Мірны:

— Усе нашы мінулыя сапернікі фарміравалі каманду з індывідуальных ігракоў, а вось шведы зрабілі стаўку на парных тэнісістаў. І гэта іх вялікі плюс. Акрамя таго яны ў адрозненне ад іспанцаў і аргенцінцаў, у якіх мы ўжо выйгравалі на хуткім пакрыцці, цудоўна гуляюць на хардзе.

— У шведаў добрая лаўка запасных, — дадаў Уладзімір Валчкоў. — Аднак гэта я хутчэй аднёс бы да мінусаў шведскай зборнай, бо калі мы за пяць месяцаў ведаем, што нам з Максімам давядзецца выйсці на корт, трэба рыхтавацца абавязкова, то ў сапернікаў ёсць выбар і ад гэтага некаторыя з тэнісістаў могуць расслабіцца.

На пытанне, чым Валодзя растлумачыць сваю цудоўную гульню на Кубку Дэвіса (на іншых спаборніцтвах зараз ён выступае не настолькі паспяхова), тэнісіст адказаў жартам: нават незараджанае ружжо раз у год страляе. Праўда, на гэтым кур'ёзы не скончыліся. Аўтарам невялікага казусу стаў навічок каманды Павел Катляроў, які ад хвалявання нечакана вымавіў: «Я дапамагаю рыхтаваць нашых ...сапернікаў». «Ён у эйфарыі ад таго, што трапіў у зборную, — адрэагаваў на такую заяву капітан беларускай дружыны Дзмітрый Татур. — А на самай справе хацеў сказаць, што дапамагае рыхтавацца да матча нашым тэнісістам». Застаецца спадзявацца, што шведскія ігракі не напалохаюць нашага дэбютанта, як журналісты, калі той усё ж выйдзе на корт. А разгубіцца ёсць з-за чаго: сапернік нашай каманды — вельмі сур'ёзны.

Капітан шведскай дружыны Матс ВІЛАНДЭР.

Фота БЕЛТА

За час свайго выступлення на Кубку Дэвіса (з 1925 года) шведская каманда правяла 206 матчаў, з якіх 140 выиграла. Беларусы стартавалі ў чэмпіянаце свету сярод мужчынскіх каманд у 1994-м і за гэты час правялі 31 сустрэчу, прычым святкавалі перамогу 21 раз (пяць з іх усухую). Зараз рэйтынг нашай каманды вышэйшы за пазіцыю шведаў — адпаведна дзевяты і дванаццаты. Затое сусветную групу нашы сапернікі пакідалі толькі аднойчы — у 2000-м, а Сярэбраную салатніцу заваёўвалі сем разоў, прычым тройчы ўладальнікам трафея станавіўся цяперашні капітан зборнай Матс Віландэр. Гэта культавая асоба ў сусветным тэнісе: у гісторыю ён увайшоў як самы юны ігрок, які перамог на турніры Вялікага шлема, бо выйграў Ралан Гарос ва ўзросце 17 гадоў 9 месяцаў, а наогул Віландэр сем разоў станавіўся мацнейшым у адзіночным разрадзе і адзін у парным. Цікава, што шведскі капітан не толькі дасюль удзельнічае ў тэнісных турнірах у спаборніцтвах ветэранаў, але і піша вершы, прозу і ... музыку. Хутчэй за ўсё сваю новую кампазіцыю настаўнік створыць пад уплывам візіту ў Мінск і па выніках матча. Аднак спачатку адна з каманд праспявае сваю лебядзіную песню. І яшчэ невядома, хто засмяецца апошнім.

Нагадаем, што акрамя матча Беларусь—Швецыя, таксама адбудуцца наступныя паядынкі: Расія—Чылі, Францыя—Румынія, Харватыя—Германія, Аўстралія—Бельгія, Чэхія—ЗША, Швейцарыя—Іспанія, Аўстрыя—Аргенціна. Пераможца матча ў Мінску выйдзе на мацнейшую каманду апошняй пары.

Ірына ПРЫМАК.

Прэс-канферэнцыя беларускай каманды.

Фота БЕЛТА

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА.

Падумай і рашы!

В. Паўлі (6+4). Мат за 3 хады.



П. Пацільоль (9+9). Выйгрыш.



У гэтых пазіцыях праходзяць цікавыя дуэты. У першай чорнабелы дуэт выступае ажно чатыры (!) разы, у другой адбываюцца баталіі пешак.

Адказы, калі ласка, дасылайце на адрас нашага шахматнага аддзела.

Праверце свае рашэнні

Змяшчаем рашэнні заданняў навагодняга конкурсу рашэння шахматных кампазіцый, апублікаваных у нашым аддзеле 6 студзеня гг.

№ 1. В. Мерэдыт. Адна з папулярных задач аўтара. У пачатковым становішчы ўсё зразумела: 1. ... Ка~~ 2. Кс2; 1. ... Kd~~ 2. Фh8х; 1. ... Ке5 2. Сс5х. Рашае прыгожы першы ход: 1. Фh5!! — цугцванг і новыя маты: 1. ... gh 2. Kf5х; 1. ... Кр:е3 2. Сс5х.

№ 2. В. Мерэдыт. У колішнім усесаюзным турніры па рашэнню кампазіцый гэта задача нарабіла перапалоху. Нікому ў галаву не прыйшло распачаць рашэнне з шаха. 1. Cf3+ Крf4 2. Фа5!! Такога кшталту задачы (1875 г.) цяпер не складаюць.

№ 3. А. Мэкэнзі. 1. Фf7! ~~ 2. Лd5+; 1. ... Крd6 2. Лd7+ Крс6 3. Фd5+; 1. ... Лd4 2. Ф:е8 Кр:d6 3. Фе7+; 1. ... Лс4 2. Лd5+ Крe4 3. Фf5+; 1. ... Ле6 2. Лd5+ Кр:d5 3. Фf5+.

№ 4. Г. Аміран. 1. Cf7 Крe4 2. Cg6+ Крf4 3. Cg5+! Крe5 4. Cf6+! Крd5 5. Cf7+ Крd6 6. Се7+! Трэцяя ахвяра чарнапольнага слана! 6. ... Крс6 (6. ... Кр:е7 7. Cd5 і нічыя) 7. Cg6! Нельга 7. Се8+? з-за 7. ... Крс7! і чорныя выйграюць. 7. ... Крd5 8. Cf7+ Крe5 9. Cf6+ Крe4 10. Cg6+ Крf4 11. Cg5+ Крf3 і, што цікава, чорны кароль вярнуўся на сваё першапачатковае месца на поле f3. 12. Cf7 Крg3 13. Cd5 і нічыя.

№ 5. М. Саседкін. а) 1. Фс5 g8К 2. Лс4 Kf6х; b) 1. Лс4 g8Л 2. e4 Лg5х; c) 1. e4 g8Ф+ 2. Крe5 Фg5х.

№ 6. Э. Біргфельд. 1. Ла3! цугцванг. 1. ... Ф~~ 2. Фd5+; 1. ... Фf7 2. Лh5+ Ф:h5 3. Лf3+ Фf3 4. Фd5+ Ф:d5х.

* * *

У наступным шахматным выпуску мы мяркуем апублікаваць вынікі конкурсу рашэння кампазіцый за 2006 год і вынікі навагодняга конкурсу.

* * *

Прыводзім адказы на кампазіцыі, апублікаваныя ў нашых шахматных выпусках 1 і 19 снежня мінулага года і 20 студзеня гэтага года.

В. Разінкін. а) дыяграма 1. Cb3! b) 1. Kd8!

В. Разінкін. 1. Ла3! Лb8 2. Ла7; 1. ... Лf8 2. Лh5+.

В. Рудзянка, В. Мельнічэнка. 1. Л:d5! 1. Фb6? Cb5! 1. K:d5? C:d3!

Ю. Аляксееў. 1. Фb8! 1. Крf4? g3! 1. Ке3? cd!

С. Давыдзюк. 1. Ле4! Кр:е4 2. Фе5+; 1. ... Крс5 2. Фb7.

У. Сычоў. Шахматы: 1. Фg5+ Крe6 2. Фg6 Крe5 3. Kd5+ Фс3 4. K:e7! Лd5 5. Кс6х; 3. ... Лс3 4. K:e7 Фd5 5. Л:d5х. Шашкі: 1. ef2 fg3 2. fe3 gf2 3. ab4 c:c1 4. hg5 f:b2 5. gh6 і выйгрыш.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.45	17.04	9.19
Віцебск —	7.38	16.49	9.11
Магілёў —	7.35	16.54	9.19
Гомель —	7.27	16.55	9.28
Гродна —	7.59	17.20	9.21
Брэст —	7.55	17.25	9.30

Месяц

Поўня квадра 10 лютага
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Марыі, Антона, Аркадзя, Івана, Іосіфа, Пятра, Сямёна, Фёдара;*
К. *Гераніма, Пятра, Яна.*

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	-1 — +1 °С	МАСКВА	-10 — -8 °С
ВІЛЬНЮС	-9 — -7 °С	РЫГА	-10 — -8 °С
КІЕЎ	+1 — +3 °С	С-ПЕЦЯРБУРГ	-15 — -13 °С

Без ападкаў

Дзве даты

8 лютага

1904 год — японскі флот напаў на караблі рускай Ціхаакіянскай эскадры ў Порт-Артуры. Пачатак Руска-японскай вайны. Нягледзячы на раптоўнасць тарпеднай атакі, японцам не ўдалося знішчыць ніводнага баявога карабля праціўніка і дасягнуць рашаючых поспехаў у самым пачатку вайны. Затым быў разгром рускай арміі пры Мукдэне, флота пры Цусіме. Вайна завяршылася Портсмуцкім мірам 1905 года. Паскорыла пачатак Рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у Расіі.

1983 год — 53-гадовы Джавані Вігліота асуджаны судом штата Арызона на 34 гады турмы за тое, што быў жанаты адначасова на 105 жанчынах.

«Як цёплае адзенне абараняе ад холаду, так вытрымка абараняе ад крыўды. Памнажай сваю цярплівасць і сілу духу, тады крыўда, якой бы горкай яна ні была, цябе не закране».

Цытата дня: **Леанарда да Вінчы (1452—1519), італьянскі жывапісец, скульптар, архітэктар, вучоны, інжынер.**

УСМІХНЁМСЯ!

А вы ведаеце, чаму ў «Запарожцы» багажнік спераду?

Таму што пры такой хуткасці за рэчамі трэба сачыць.

☺

У цырульні. Майстар, які ўжо двойчы парэзаў кліента, заводзіць з ім размову:

— Скажыце, вы ў нас бывалі раней?

— Не. Руку я страціў на вайне.

☺

Мужык чытае аб'явы на слупе: «Лячу ад усіх хвароб».

— Ну-ну, ляці, ляці, — усміхаецца — ад усіх не зляціш.

Ад усёй душы віншуем з днём нараджэння цудоўнага чалавека, прафесіянала сваёй справы, чулага кіраўніка ***АЛЕКСАНДРОВІЧА АНДРЭЯ РЫГОРАВІЧА****. Вычым моцнага здароўя, шчасця, добрага настрою, міру, здзяйснення самых запаветных жаданняў.*

Родныя, сябры, калегі па працы.

Тыя, што нас берагуць

Агонь нашай памяці перад абразамі святых (свечкі-ахвяраванні)

З цягам часу свечка ўвабрала ў сябе функцыю ахвяры, якая была неабходным звяном традыцыйнай культуры беларусаў. Свечку-ахвяру неслі ў храм і ставілі перад абразамі ў час выпрабаванняў ці няшчасцяў, а таксама, каб атрымаць благаслаўленне або папрасіць дапамогі, выказаць словы ўдзячнасці ці загадаць самае патаемнае жаданне. Лічылася, калі свечка згарыць-знікне, вашы думкі абавязкова пачуе Бог.

На працягу каляндарнага года свечка неаднаразова станавілася сімвалам духоўнага дыялогу паміж чалавекам і сонмам святых, якія ў адпаведнасці са шматвяковай традыцыяй аказвалі дапамогу ў вырашэнні якой-небудзь справы, у прафесійнай дзейнасці, творчасці. Калі вернік маліўся Богу і ставіў запаленую свечку, тым самым ён сведчыў пра сваю далучанасць да храма, да веры, паслухмяна схіляў галаву перад тысячамі святых, якія ахвяравалі жыццём дзеля перамогі Дабра над Злом. І калі ў храме адбываецца набажэнства ў гонар гадавога свята, кожны з вернікаў імкнецца далучыцца да гэтага свяшчэннадзейства сваёй свечкай-ахвярай.

*Калі сям'я па нейкіх прычынах доўгі час не магла мець дзяцей, то трэба было перад Раством паставіць свечку, якая б гарэла да самай раніцы, і шчыра прасіць Багародзіцу падарыць дзіця.

*Каб памірыць мужа і жонку, трэба ўзяць дзве свечкі, звіць іх у адну, запаліць і сказаць:

«Я не свечу жгу, а два сердца соединяю на хлеб-соль за столом, на доброе житье, на семейное счастье. Аминь».

Або так:

«Ехаў Бог па чыстаму полю на сівом коніку. Конік прыстаў, а муж (хлопец, каханы, імя) любіць стаў. Стань, Бог, на помач. Ісус Хрыстос, стань на помач».

* Каб вярнуць у хату шчасце, удачу, дабрабыт, узаемаразуменне, трэба пайсці ў храм і паставіць 12 свечак у тым месцы, дзе падкажа вам ваша інтуіцыя. Перад тым як выйсці з хаты, трэба прачытаць малітву і наступныя словы:

«Стоит церковь золотая, в ней престол серебряный, над ним икона говорящая, на меня глядящая. Встану я в церкви золотой пред престолом серебряным, под иконой говорящей, Матерью Божьей глядящей. Дай ты мне, Божья Мать, с этого дня счастливою стать. Беру счастье руками, выхожу своими ногами. Во имя Отца и Сына и Святого духа. Аминь».

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 2,3 і 7лютага.)

БЕРАЖЫ ВАС БОГ І ПОЛЫМЯ СВЕЧКІ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

* Пажадана каб у кожнага члена сям'і была імянная ікона (напрыклад, у сына імя Андрэй — абраз Андрэя Першазванага). У той дзень, чысло якога супадае з датай вашага нараджэння, трэба запаліць перад абразам свечку і прачытаць наступныя словы:

«Икона святая, икона именная, огради меня от всякой хулы, от пустой болтовни и старых, и малых, от седых и молодых, от мужского языка и женского, от злости и зависти, от всякой ненависти. Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь».

* **11 студзеня** выконвалі цэлы шэраг рытуальных дзеянняў, скіраваных на захаванне здароўя дзяцей і развіццё іх творчых здольнасцяў. У гэты дзень за здароўе дзяцей у храмах ставілі свечкі, дома чыталі малітвы ў гонар нябесных ахоўнікаў, давалі памыцца асвечанай вадой, да позняга вечара ў хаце гарэла грамнічная свечка.

* **13 студзеня** пчаляры запальвалі воскавыя свечкі, каб было багата мёду і воску. У адпаведнасці з народнымі легендамі пчолы сталі святымі, таму што жалілі рукі тым, хто прычыняў боль Хрысту, а затым стараліся даць яму палёгку: прыляцелі роем і выпілі пот у час яго мучэння на крыжы. А пасля яго смерці яны першымі панеслі вестку аб яго ўваскрэсенні. Пчалу заўсёды лічылі Божай угодніцай, таму што яна прыносіць воск на свечкі: «Богу ахвяру прыносіць».

* **25 студзеня** — Таццянін дзень, свята студэнцкай моладзі. Святая Таццяна стала ахоўнікам усіх тых, хто вучыцца, таму ў гэты дзень прынята ставіць свечкі за поспехі ў вучобе.

* **14 лютага** — дзень ушанавання святога Трыфана, які здаўна лічыўся ахоўнікам сямейнага шчасця. У гэты дзень дзяўчаты ставілі свечкі ў храмах і маліліся аб шчаслівай жаночай долі і ўдалым замужжы.

* **14 кастрычніка** — Пакровы. Яшчэ адзін дзень, калі моладзь імкнулася паўплываць на свой лёс. Каб выйсці замуж, трэба было ў гэты дзень першай паставіць свечку перад іконай Багародзіцы. Лічылася, хто паставіць свечку раней за іншых, той хутчэй і замуж пойдзе. Пры гэтым дзяўчаты ціхенька шапталі: «Пакроў пакрыў зямлю снегам, раку лёдам, рыбу луской, а мяне чапцом (фатой, вэлюмам) пакрой».

Свечка-ахоўніца набывае імя

Свечкі, якія пасля малення і святочных набажэнстваў прыносілі дадому, атрымлівалі назву ў гонар свята: на Вадохрышча (19 студзеня) — **Багаяўленская свечка,** на Стрэчанне (15 лютага) — **Грамнічная**, у Чысты чацвер (чацвер напярэдадні Вялікадня) — **Чацвярговая**, на Вялікдзень — **Велікодная або Пасхальная**. Здарылася так, што найбольш вядомай і пашыранай у абрадавай практыцы аказалася **Грамнічная свечка**.

Акрамя гэтага асаблівай пашанай карысталіся свечкі, якія прымалі ўдзел у сямейна-родавых святкаваннях: **вянчальнай** называлі свечку, з якой жаніх і нявеста стаялі ў храме падчас шлюбавін; **памінальнай** — тую, якую ставілі побач з памёршым чалавекам у час адпявання, не абыходзіла без увагі свечка, якую трымалі хросныя бацькі падчас **хрышчэння** дзіцяці.

Выкарыстанне свечкі-ахоўніцы

Невыпадкова ў народнай культуры славян **з вянчальнымі свечкамі** была звязана самая значная колькасць прыкмет і вераванняў. Так, па народных уяўленнях, яркае полымя царкоўных свечак пры вянчанні прадказвала маладым шчаслівае жыццё; ціхае, спакойнае — дружнае, але непрацяглае сумеснае жыццё; калі свечкі моцна трашчалі — жыццё іх будзе неспакойным.

* Лічылася не зусім добрай прыкметай, калі ў каго-небудзь з маладых патухне вянчальная свечка, меркавалі, што жыццёвая дарога ў таго з маладых будзе карацейшай.

* Старыя людзі раілі вянчальныя свечкі захоўваць усё жыццё, таму пасля вянчання іх загортвалі ў хусцінкі, у якіх трымалі падчас царкоўнага абраду, перавязвалі «васьмёркай» чырвонай стужкай і клалі за бажніцу.

* **Велікодная свечка** карысталася асаблівай пашанай сярод нашых пастухоў. Той, хто закатае ў ражок або пугу хоць крышачку яе воску, той не згубіць ні адной каровы і на працягу ўсяго пашавага перыяду будзе адчуваць клапатлівую перасцярогу нябёсаў.

* **Чацвярговая свечка**, узятая ў храме ў Чысты чацвер, была надзелена «ачышчальнай» функцыяй: з яе дапамогай лячылі эпілепсію, сурокі, пужанне, рожыстае запаленне.

Рэгламентацыі ў адносінах да свечкі

* На працягу года свечкі захоўвалі ў чырвоным куце хаты і выкарыстоўвалі толькі ў час адпаведных рытуальных дзеянняў.

* Аплаўлены воск грамнічнай і іншых абрадавых свечак, напрыклад, вянчальных, велікодных і іншых захоўвалі на працягу ўсяго жыцця як моцны і надзейны абярэг.

* У паўсядзённым жыцці або ў час якіх-небудзь абрадавых дзеянняў з палаючымі свечкамі забаранялася, каб у хаце адначасова гарэлі тры свечкі. У народзе існуе перакананасць, што гэта можа быць прадказаннем хуткай смерці каго-небудзь з дамачадцаў.

* Не давалі ў рукі і не запальвалі свечкі тым парам, у якіх адзін з маладых браў шлюб у другі або трэці раз.

* Сёння паўсюдна існуе звычай тушыць свечкі на імянінным караваі. Прычым свечак павінна быць столькі, колькі гадоў пражыў чалавек. Калі перад гэтым загадаць самае патаемнае жаданне, яно абавязкова здзейсніцца.

* У той жа час царкоўную свечку непажадана задуваць, яе лепш акуратна патушыць рукамі.

* Агаркі ад свечак, якія застаюцца дома, нельга выкідваць. Іх трэба сабраць і аднесці ў храм.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Формула ўдачы

Востраў заўтрашняга дня

Павел Лунгін, рэжысёр фільма «Востраў», які ў мінулым годзе быў прызнаны лепшым расійскім фільмам, зацікавіўся матэрыялам, прапанаваным беларускім аўтарам Андрэем Курэйчыкам. Яго «Тры Жызэлі» абяцаюць увасобіцца ў сумесны расійска-французскі фільм, у якім будзе іграць вядомая французская актрыса, прынамсі, перамовы вядуцца з Ізабэль Юпэр.

Такім чынам, паспрабаваўшы сябе ў тэатры, Андрэй Курэйчык вырашыў некалькі сваіх ідэй прапанаваць у кіно. Першы фільм паводле яго сцэнарыя выйдзе на экраны на пачатку сакавіка. Гэта камедыя Аляксандра Стрыжэнава «Любовь-Морковь», з Гошам Куцэнкам і Крысцінай Арбакайтэ. Бюджэт фільма склаў каля 4 мільёнаў долараў, выходзіць ён больш чым на 600 копіях адразу ў некалькі краінах СНД.

Але як вядома, не заўсёды бюджэт красіць кінакарціну, а вось імя рэжысёра — дакладна. Яшчэ некалькі сцэнарыяў Курэйчыка зацікавілі расійскіх кінавытворцаў і пайшлі ў работу. Але стала вядома толькі пра будучы праект Паўла Лунгіна, які яшчэ зняў фільмы «Таксі-блюз», «Вяселле», «Бедныя родныя». Усе такія розныя. Але пасля «Вострава» як увогуле нешта можна здымаць?.. Паглядзім.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Таленты, як чуеце?

ПЛЫНІ «НОВАЙ ХВАЛІ» АДКРЫТЫ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

У беларускіх выканаўцаў ёсць дадатковая магчымасць прабіцца на прэстыжны міжнародны конкурс маладых выканаўцаў «Новая хваля», які праходзіць штогод у Юрмале. Сёлета правесці рэспубліканскі адборачны тур аргкамітэт конкурсу даверыў гомельскай «Студыі 7».

Раней нашы артысты ўжо спрабавалі сябе паказаць: пазалетась у «Новай хвалі» ўдзельнічаў Аляксей Хлястоў, летась у адборы ўдзельнічалі Гюнеш Абасава і Георгій Калдун. Але грандыёзнымі поспехамі ў «Новай хвалі» мы пакуль што пахваліцца не можам. Што ж, гэтым летам ніхто не забараняе паспрабаваць шчасця зноў. Тым больш, што першы адборачны этап можна прайсці і дома, дзе, як кажуць, сцены дапамагаюць: генеральны дырэктар «Новай хвалі» Аляксандр Румянцаў даў права прадстаўляць інтарэсы конкурсу ў Беларусі музыкантам з калектыву «Студыя 7» (Гомель). Менавіта ў гэтай студыі, нагадаем, у свой час працавалі рэпер Сярога (Сяргей Пархоменка) і спявак Макс Лорэнс (Максім Сапацькоў).

Як расказаў кіраўнік «Студыі 7» Валерый Шоман, усё атрымалася спантанна, проста таму, што кіраўніцтва вялікага расійскага холдынгу «АРС» пасябравала з беларусамі. Зрэшты, пры жаданні можна адшукаць у дырэктара «Новай хвалі» Аляксандра Румянцава беларускія дваранскія карані (пладоў Румянцавых у Гомелі і дагэтуль няблага захаваўся). Так ці інакш, сёлета тыя, хто лічыў прабіцца ў Маскве немагчымым, могуць пачаць з Гомеля.

Маладыя таленавітыя выканаўцы, калі ім ад 14 да 30 гадоў уключна і яны ну вельмі жадаюць паехаць на «Новую хвалю», павінны, па-першае, даслаць свае заяўкі: 3—4 творы, з якіх 1—2 абавязкова на замежнай мове. Музычны жанр, у якім працуюць артысты, не важна — існуе толькі падзел на катэгорыі «Сола», «Дуэт» ці «Ансамбль». Анкеты, а таксама музычныя матэрыялы на аўдыё- або відэаносьбітах прымаюцца да 17 сакавіка ў беларускім аргкамітэце: 246050 Беларусь, г. Гомель, вул. Ірынінская, 16, ГЦК, пак. 418, з пометкай «Новая хваля-2007». Акрамя таго, дадатковую інфармацыю можна знайсці на спецыяльна створаным сайце newwavestares.at.tut.by.

Але гэта толькі першы этап. 17 сакавіка ў Гомелі пройдзе гала-канцэрт пераможцаў адбору і пераможцаў мінулых конкурсаў «Новая хваля». З Масквы на канцэрт прыедзе журы — эксперты кампаніі «АРС». Менавіта яны выбяруць, хто з беларускіх прэтэндэнтаў варты ўзяць удзел у агульным інтэрнацыянальным паўфінале, які пройдзе ў Маскве ў забаўляльным комплексе «Метелица» пад наглядам Ігара Крутога, Райманда Паўлса і зорак шоу-бізнэсу Расіі. Ну, а хто здолее дайсці да фіналу ў Юрмале — пакуль нават загадваць рана.

Як расказаў Валерый Шоман, з пачатку адбору 1 студзеня ў аргкамітэт прыйшло ўжо больш за 60 заявак, у тым ліку і ад вядомых выканаўцаў — праўда, іх імёны пакуль не называюцца, але праз нейкі час гэты сакрэт Полішынеля ўсё адно раскрыецца. Гэтаксама не называецца склад беларускага журы, але гарантавана, што кандыдатаў будуць разглядаць і ацэньваць не менш як 10 прафесіяналаў эстрады і шоу-бізнэсу. «Мэтраў у нас хапае, але ў многіх з іх, я дакладна ведаю, некалькі прадузятыя адносіны да пэўных артыстаў. Мы пастараемся пазбегнуць лабіравання чыіх бы там ні было інтарэсаў; у прыватнасці, мае музыканты ўвогуле не будуць удзельнічаць у адборы», — адзначыў на гэты конт кіраўнік «Студыі 7». Зрэшты, у яго і без конкурсу год абяцае быць насычаным — на музычны рынак выпускаецца аднайменны студыі гурт, і яго раскруткай давядзецца шчыльна займацца. Астатнім жа, як выканаўцам, так і прадзюсарам — чым не шанц? «Новая хваля» — адно з нямногіх месцаў, дзе ў паняцце «фарматнасці» ўкладаецца толькі талент...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 758. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12